

БУДНІ МАЛАДОГА ЎРАЧА «ХУТКАЙ»
ЧЫРВОНКА

ПРАФЕСІЯ ВУЧОНАГА — САМАЯ ЦІКАВАЯ Ў СВЕЦЕ
ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЛІПЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 128 (30008)

## КОРАТКА

• У Беларусі азімы ячмень убралі на 10,5 тысячы гектараў.



• **Беларускую харчовую прадукцыю прадставяць на выстаўцы «ІННАПРАМ».**

• У Магілёве ўрачыста адправілі студэнцкі будаўнічы атрад у расійскі Варонеж.

• **ЦТ па замежнай мове на 100 балаў напісалі 140 абітурыентаў.**

• Кацірох на вырабы з чорных металаў працягваюць зніжацца на БУТБ.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

*«Мы навучыліся чуць адно аднаго. Гэта вельмі важна. Калі ёсць нейкае пытанне, заўсёды ёсць на яго адказы. Калі шукаць іх разам, то заўсёды можна знайсці рашэнне, якое задавальняе ўсе бакі. У канфлікце можна і патануць, гэта няправільны шлях. Правільны шлях — кампраміс, умець шукаць рашэнні, накіраваныя перш за ўсё на дабрабыт людзей, забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці. У гэтым самае вялікае дасягненне паміж бакамі (урадам, наймальнікамі, прафсаюзамі). Гэтага мы здолелі дамагчыся, навучыліся рабіць. У гэтым сэнс сацыяльнага партнёрства».*

ISSN 1990 — 763X
23128
9 771990 763008

З першых вуснаў

# «АБАРОНА РАДЗІМЫ БЫЛА І БУДЗЕ Ў РУКАХ МУЖНЫХ, МОЦНЫХ ДУХАМ І АДВАЖНЫХ ЛЮДЗЕЙ»

### Прэзідэнт уручыў Падзякі найлепшым выпускнікам вышэйшых ваенных навучальных устаноў і даў наказ перад службай

**Цырымонія ўшанавання выпускнікоў ваенных ВНУ, якія вызначыліся падчас вучобы, стала ўжо традыцыяй. Гэтая ўрачыстасць на працягу апошніх гадоў завяршае мерапрыемствы, прысвечаныя галоўнаму дзяржаўнаму святу краіны — Дню Незалежнасці.**



Фота БелТА.

### «БЕЛАРУСЬ ПРАЦЯГВАЕ ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ СІСТЭМУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ»

Кіраўнік дзяржавы назваў гэтую цырымонію данінай памяці пакаленню пераможцаў, героям, якія вызвалялі 3 ліпеня Мінск, ачышчаючы родную зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «У нашай краіне абарона Радзімы была і будзе ў руках мужных, моцных духам і адважных людзей, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Такіх, як вы — сапраўдных мужыкоў, якія апранулі афіцэрскі мундзір у гэты цяжкі і часам непрадказальны час».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што афіцэры добра ведаюць сучасную ваенна-палітычную абстаноўку. «Пасляваеннае светаўладкаванне, заснаванае на міжнародным праве, якое і так не заўсёды спрацоўвала, абрынулася, — канкрэтызаваў ён. — Геапалітычная напружанасць паміж дзяржавамі — членамі блока НАТА з аднаго боку, Расіяй, Кітаем, іншых краін — з іншага боку перайшла ў гарачую фазу. На гэтым фоне назіраем, як краіны-суседзі нарошчваюць ваенныя бюджэты, закупляюць наступальнае ўзбраенне для сваіх армій, павялічваюць склад войскаў НАТА на сваіх тэрыторыях, праводзяць бясконцыя вучэнні каля нашых граніц. Арсенал сродкаў умяшання пад надуманымі падставамі ва ўнутраныя справы нашай краіны пашыраецца».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што, акрамя эканамічнага дыктату, палітычнага і інфармацыйнага ціску, мы сёння сутыкаемся з правакацыямі на нашых знешніх рубяжах, спробамі тэрарыстычнай дзейнасці ўнутры краіны, інспіраваных звонку. Беларусь адэкватна рэагуе на ўсе гэтыя выпады і працягвае ўдасканальваць сістэму нацыянальнай і, у першую чаргу, ваеннай бяспекі Беларусі.

«Гэта люстраныя меры па абароне суверэнітэту дзяржавы, без якога не будзе ні міру, ні беларусаў як нацыі, — патлумачыў Прэзідэнт. — У сваёй гісторыі мы гэта ўжо не раз праходзілі. І, вядома, усе мы разумеем, што тэхнічны арсенал, якім бы магутным ні быў, не стане перавагай у сіле без прафесіяналаў, без адданых роднай краіне і народу воінаў. Вайна ва Украіне гэта ярка дэманструе».

### «ВЫБРАЎШЫ ДЛЯ СЯБЕ ШЛЯХ СЛУЖЭННЯ АЙЧЫНЕ, АФІЦЭРЫ ЗРАБІЛІ ВЫСАКАРОДНЫ ВЫБАР»

Па словах беларускага лідара, вырашальную ролю ва ўмацаванні абараназдольнасці краіны, абароне мірнай працы яе грамадзян маюць ваенныя. «Іх ядро — вы, афіцэрскі корпус, — звярнуўся да ўдзельнікаў цырымоніі кіраўнік дзяржавы. — Наперадзе ў вас — служба ў падраздзяленнях, воінскіх часцях і органах ваеннага кіравання. Лёгка не будзе. Афіцэрская служба заўсёды спалучана з цяжкасцямі, нягодамі і пэўнымі абмежаваннямі. Мы з вамі гэта добра ведаем».

СТАР. 2

Напярэдадні

# КУПАЛЬСКІ АБЯРЭГ

### Карэспандэнт «Звязды» паназірала за падрыхтоўкай да свята ў Александрыі





**Яшчэ на падыходах да месца дзеяння было відаць, як кіпіць работа. І першае, што кідаецца ў вочы, — гэта высачэзная купальская сцэна, з якой да прысутных звернецца Прэзідэнт краіны і дзе адбудзецца галоўнае купальскае дзейства, за якім будуць назіраць тысячы чалавек. Білеты на яго, дарэчы, былі раскупленыя ўжо месяц таму. Наколькі маштабным і багатым на спецэфекты будзе прадстаўленне, можна меркаваць па тых канструкцыях, якія манціруюць рабочыя. На вялікіх скрынях пазначана — Blackout — назва вядомага арганізатара ўсіх грандыёзных канцэртаў у Беларусі.**

СТАР. 13

Загарадная нерухомасць

# Прапанова значна перавышае попыт

### Дзе мацней за ўсё патаннелі дачы?

**На рынку індывідуальных будынкаў мегаполіса і сталічнага рэгіёна адбыліся змены. Гэта датычыцца сучасных прасторных дамоў (пабудаваных пасля 2010 года), старых дамоў (збудаваных да 2010 года, плошчай да 100 «квадратаў»), участкаў, недабудаваных дамоў і дач.**

СТАР. 4



# «АБАРОНА РАДЗІМЫ БЫЛА І БУДЗЕ Ў РУКАХ МУЖНЫХ, МОЦНЫХ ДУХАМ І АДВАЖНЫХ ЛЮДЗЕЙ»




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка перакананы: выбраўшы для сябе шлях служэння Айчыне, афіцэры зрабілі высакародны выбар — узялі на сябе адказнасць за мір і бяспеку на роднай зямлі. «Асабліва ў наш час», — удакладніў Прэзідэнт і заўважыў, што вельмі добра разумее ваеннаслужачых. Пакуль хтосьці гуляе, адпачывае, яны служаць Радзіме, абараняюць сваю зямлю, у тым ліку і тых, хто ў гэты час гуляе.

«Вам трэба будзе эфектыўна вырашаць складаныя і адказныя задачы па павышэнні ўзроўню баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці, забяспечваць найвышэйшую вывучку і зладжанасць органаў ваеннага кіравання і войскаў, навучаць падначаленых сучасным спосабам вядзення ўзброенай барацьбы, — даў наказ Галоўнакамандуючы. — Перакананы, вы з гонарам выканаеце ўсе пастаўленыя перад вамі задачы, забяспечваючы мір і бяспеку Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў афіцэраў з заканчэннем вучобы і пажадаў поспехаў у святой справе служэння Беларусі і беларускаму народу. За выдатныя



поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку кіраўнік дзяржавы ўручыў Падзякі Прэзідэнта Беларусі.

## «НАША ЗАДАЧА — АБАРАНІЦЬ РАДЗІМУ»

У завяршэнні цырымоніі ўшанавання выпускнікоў ваенных ВНУ беларускі лідар адзначыў, што на цяперашняе пакаленне выпала нялёгкая доля. «Я часам думаю над словамі нашых суайчыннікаў, якія кажуць: «На фронце было лягчэй, бо ворага бачыш твар у твар», — удакладніў ён. — Мы твар у твар свайго ворага не бачым, хоць дакладна вызначылі яго каардынаты. Ды і вайна цяпер такая, што твар ворага не разгледзець».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што вельмі ўважліва назірае за ваеннымі дзеяннямі ва Украіне: «Беспілотнікі, контрбатарэйная барацьба... Я артылерыста спытаў: «Умееш весці контрбатарэйную вайну?» — «Умею». Гэта вялікая справа. Без гэтага немагчыма, як мне расказвалі ваенныя, якія ваююць ва Украіне. Беспілотныя лятальныя апараты сталі ледзь не галоўным метадам і зброяй вядзення сучасных войн. І шмат што іншае. Вы гэта добра, напэўна, ужо ведаеце».

Прэзідэнт папярэдзіў выпускнікоў ваенных ВНУ аб тым, што, нягледзячы на вучобу, якая скончылася, вучыцца давядзецца ім кожны дзень. «Жыццё дае і ў паветры, і на зямлі нам усё новыя і новыя ўрокі», — пахлумачыў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што вельмі высока цэніць афіцэрскі мундзір. Па словах кіраўніка дзяржавы, калі мужык яго апрануў, ён павінен быць сапраўдным мужыком і абараняць гэтую Радзіму. «Будзьце заўсёды вартыя сваёй зямлі!» — даў наказ афіцэрам Галоўнакамандуючы.

Ён нагадаў, што не так даўно казаў наконт тэрытарыяльнай абароны, народнага апалчэння. «Патрабаванне адно — абараніце сябе і сваю сям'ю, — падкрэсліў Прэзідэнт. — А наша з вамі задача (кадравых ваенных. — **«Зв.»**) — абараніць Радзіму. Мы, ваенныя, будзем абараняць Радзіму!»

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

### У тэму

**У размове з журналістамі выпускнікі вышэйшых ваенных навучальных устаноў, якія вызначыліся ў вучобе, расказалі, чаму абралі шлях служэння Айчыне і беларускаму народу, а таксама падзяліліся, чым карысны для іх, ужо дзеючых афіцэраў, была вучоба.**

Для **выпускніка факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл падпалкоўніка Міхаіла САДЫКАВА** служба ў арміі стала сямейнай традыцыяй. У розны час сваё жыццё Узброеным Сілам прысвяцілі яго прадзед, дзед, бацька і родны брат. Падпалкоўнік расказаў, што навучанне на факультэце генштаба давалася нялёгка, але было вельмі цікава. «Перш за ўсё гэта той найбагацейшы вопыт, які спатрэбіцца кожнаму афіцэру, — заўважыў выпускнік. — Факультэт рыхтуе афіцэраў аператыўна-тактычнага ўзроўню, аператыўна-стратэгічнага звяна кіравання. Па вялікім рахунку, кожны выпускнік факультэта Генеральнага штаба ў далейшым будзе кіраўніком структурных падраздзяленняў Мінабароны, Генеральнага штаба Узброеных Сіл, злучэнняў, воінскіх часцей».

Як расказаў **выпускнік факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Андрэй СЕВЯРЫНЧЫК,** ён скончыў не проста навучальную ўстанову, а ваенную альма-матар, дзе выбітныя выкладчыкі перадаюць свой вопыт, вучаць правільна ацэньваць абстаноўку, а таксама дапамагаюць вызначаць задачы для дасягнення галоўнай мэты, якую ставяць перад сабой ваеннаслужачыя. А гэта, па словах Андрэя Севярынчыка, мір і стваральная праца. Ваеннаслужачы расказаў, што ў свой час перад ім пытанне аб тым, якую прафесію выбраць, нават не паўставала: у арміі служылі яго бацька і брат. Шлях служэння Айчыне абрала і жонка выпускніка факультэта Генштаба. Не выключана, што ваенная дынастыя працягнецца. І гэта нягледзячы на тое, што Андрэй Севярынчык выхоўвае дзвюх дачок. «Малодшая ўвесь час побач са мной і кажа, што хоча быць як бацька», — заўважыў ваеннаслужачы.

**Камандзір 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады палкоўнік Ігар ГЕГЕЛЬСКІ** таксама скончыў факультэт Генеральнага штаба Узброеных Сіл. «У сценах нашай Ваеннай акадэміі я набыў каласальны вопыт, які дазваляе разумець тое, што адбываецца не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і ў цэлым у свеце, — адзначыў ён. — Той узровень ведаў і навыкаў, які падчас навучання на факультэце Генеральнага штаба дае прафесарска-выкладчыцкі склад, адкрывае перад намі вялікія магчымасці, якія мы можам рэалізаваць у сваёй далейшай кар'еры». Ігару Гегельскаму таксама было на каго раўняцца: ва Узброеных Сілах служыў яго бацька, які першы расказаў свайму сыну аб самай высакароднай прафесіі — Радзіме служыць.

Па сутнасці

# РОЗНЫЯ І РОЎНЫЯ



Беларусь заўжды была, ёсць і будзе. Паміж Захадам і Усходам. У гэтым наша сіла. У гэтым наш геапалітычны крыж. Мы цягнемся да міралюбівай місіі — будаваць масты. Але нас зноў і зноў прымушаюць быць Брэсцкай крэпасцю. Такі лёс нашай дзяржаўнасці. Нават паміж суседзямі здараецца так, што яны сварацца. Ці варта ж здзіўляцца непаразуменням паміж краінамі? А калі размова пра розныя цывілізацыі? А мы ж на памежжы. Калектыўны Захад і Расія. Раней хаця б у аднаго Бога верылі. Цяпер заходні істэблішмент адвярнуўся ад біблейскіх каштоўнасцяў. Стварылі сваю «біблію неалібералізму». «Новага чалавека» лепяць не з гліны, а з заган. Расія, наадварот, апранаецца ў даспехі віцязя, які бароніць ісціну і чалавечнасць. Але пачатак усіх супярэчнасцяў у звычайным і прымітыўным — у скваплых адносінах да чужога багацця: англасаксонскія эліты не згодныя, што два працэнты жыхароў планеты валодаюць трацінай сусветных радовішчаў карысных выкапняў. Гэта пра рускіх, пра нашых суседзяў, пра нас. А па-іншаму так званыя заходнія эліты не ўмеюць — толькі рабаваць.

Геапалітычны «водападзел» прайшоў па акваторыі Буга. Неадной з таго боку ішлі заваёўнікі і акупанты. Цяпер на свой сусветны гвалт, рабаванне і махлярства яны навучыліся атрымліваць індульгенцыю ад міжнародных інстытутаў. Апраўдваць свае ўчынкі сусветнай «перамогай дэмакратыі і міжнародных правоў». Амерыканцы так дыскрэдытавалі гэтыя штампы, што брыдка становіцца. Таму значная частка чалавецтва імкнецца ствараць свае лакацыі для перамоў і ўзаемнага развіцця. Вось і атрымліваецца: з аднаго боку — ААН, ПАСЕ, АБСЕ, з другога — ШАС, БРІКС, АСЕАН. Па розныя берагі Буга. І мы зноў паміж гэтага «водападзелу».

Што цікава, беларусы — адны з заснавальнікаў ААН. Мэта была велічная: каб больш ніколі іншыя народы не страчвалі кожнага трэцяга. Але сёння сусветную трыбуну ператварылі ў бюро па дазволах на экспансію і войны. Пасля развалу Савецкага Саюза Лондан і Вашынгтон «захапілі» ААН — насамрэч сусветны «рэйдарскі захоп» у геапалітыцы. Прабачце, але вельмі саманадзейна. Мы гэтую вяршыню сусветнай дыялогавай пляцоўкі не пакінем. Па-першае, цана — мільёны жыццяў беларусаў, па другое — каб увесь свет чуў мірныя ініцыятывы Беларусі. Як бы там ні спрабавалі перашкодзіць выказаць канструктыўныя словы — іншыя краіны чуюць.




**Незалежная Беларусь выходзіць на прастор Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.**

Альтэрнатыва — палітычная і эканамічная — еўраазіяцкі вектар. І там нас ведаюць. Не толькі, напрыклад, дзякуючы «БелАЗам» — магутным асілкам. Але і волату палітыкі. Аляксандра Лукашэнку лічаць патрыярхам еўразійскай інтэграцыі. І гэта сапраўды так. Беларусь заўсёды выступала за здаровае раўнапраўнае збліжэнне. Узяць хаця б той жа прыклад Саюзнай дзяржавы. Арыенцір для постсавецкай прасторы. Падцягвайцеся. Санкцыі супраць Расіі яскрава прадэманстравалі сапраўдны твар заходніх «партнёраў». Нельга разлічваць на іх палітычнае і эканамічнае сумленне. Трэба разам выпрацоўваць самадастатковую эканамічную палітыку. Каб замест спаборніцтва за рынкі збыту развіваць прамысловую кааперацыю.

Цяпер незалежная Беларусь выходзіць на прастор Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Гэтае аб'яднанне працягвае набіраць геапалітычную моц, але пры гэтым застаецца клубам раўнапраўных дзяржаў. ШАС у эканамічным плане — гэта альтэрнатыва ЕС, у палітычным — «сямёрцы». Гэта і вялізная пляцоўка спажыўцоў — больш за 3 мільярды чалавек — амаль кожны другі жыхар планеты. «Шанхайскі дух» блізкі і міжнародным ініцыятывам Мінска. Гэта ўзаемадзеянне розных цывілізацый без паглынання і дамінавання вялікіх над малымі. Дзеля агульнага дабра ўлічваючы інтарэсы кожнага. Гэта тое, чаго так не хапае заходняму светаўладкаванню. Альтэрнатыўны мэйнстрыму заходніх палітычных саюзаў «шанхайскі дух» блізкі пазіцыі Мінска — развівацца не ў піку камусьці, а дзеля агульных выгод. Такі запыт у многіх краін свету. У самых вялікіх дзяржаў свету. Нарэшце надыходзіць той час, калі невялікі Захад, нібыта хвост галавой, перастае віхляць вялікім Усходам.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Паслясвяточнае

# Заўсёдны выхадны і салют да дня нараджэння

## Па ўсёй краіне віншуюць маленькіх беларусаў, якія нарадзіліся ў Дзень Незалежнасці

**Сёлета ў Беларусі ў Дзень Незалежнасці краіны нарадзілася 121 немаўля, 20 з якіх — мінчане (11 дзяўчынак і 9 хлопчыкаў). Самым багатым на дзетак стаў раддом 6-й сталічнай бальніцы. Тут на свет з'явіліся дзесяць новых беларусаў, сярод якіх двайняты-хлопчыкі і самае першае «святочнае» немаўля краіны. У межах праекта «Белая Русь — з любоўю да дзяцей!», які, дарэчы, 15 гадоў таму рабіў свае першыя крокі менавіта ў гэтым раддоме, ушанаваць матуль, якія нарадзілі дзетак у дзяржаўнае свята, у раддом завітала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**


Фота БелТА.

### «Вы робіце самую галоўную справу ў жыцці — нараджаеце нам беларусаў»

З такімі словамі звярнулася сенатар да матуль, падкрэсліўшы, што «адна з самых галоўных з'яў у іх жыцці супала з адной з найгалоўнейшых з'яў у жыцці краіны — Днём Незалежнасці».

Наталля Качанава падзякавала жанчынам за тое, што яны прынялі рашэнне нарадзіць краіне маленькіх беларусаў, якіх дзяржава насамрэч вельмі чакае, паралельна не спыняецца на дасягнутым і пажадала, каб дзеці выраслі сапраўднымі беларусамі:

— Статус сям'і і нараджэнне дзяцей для нас сёння вельмі важныя. Наша моладзь не імкнецца хутка нараджаць і пазней ствараe сям'ю, аднак важна, каб кожны разумеў, што ў сваім жыцці ён павінен зрабіць усё, што ад яго залежыць. А ад нас, жанчын, перш за ўсё залежыць, ці дадзім мы жыццё тым, хто будзе працягваць яго ў нашай Беларусі. Для кожнага чалавека вельмі важна, каб побач былі блізкія і родныя людзі.

З двайным святам павіншаваў матуль і **член Савета Рэспублікі Алег РАМАНАЎ, старшыня партыі «Белая Русь»,** які ўпэўнены, што віншаваць маладых матуль у Дзень Незалежнасці — удалае рашэнне:

— Эфект яднання гэтых двух свят — вашай сям'і і нашай краіны — зробіць вас шчаслівымі. Вы будзеце мець мацярынскае і чалавечае шчасце, бо жывяце ў шчаслівай і прыгожай краіне. Штогод мы віншуем матуль па ўсёй краіне і дзякуем ім за тое, што яны робяць унёсак у дэмаграфічнае развіццё краіны, бо людзі — гэта галоўны рэсурс дзяржавы.

Ён удакладніў, што з часам акцыя «Белая Русь — з любоўю да дзяцей!» будзе пашыраць новымі сэнсамі, бо многія дзеці, якія нарадзіліся за час існавання акцыі, ужо вучацца ў школе. Пэўна, было б добра віншаваць малых з пачаткам навучальнага года і пасля з іншымі іх асабістымі святамі і, такім чынам, весці іх па жыцці, робячы так, каб «Белая Русь» была спадарожнікам юных беларусаў, якія нарадзіліся ў Дзень Незалежнасці.

— Гэтыя жанчыны з'яўляюцца прыкладам для іншых, — падкрэсліў **Уладзімір КУХАРАЎ, старшыня Мінгарвыканкама,** віншуючы матуль. — Ім будзе аказана дапамога і падтрымка ва ўсім.

### Дзевяць хлопчыкаў і дзяўчынка

Матулі вельмі дзякавалі ўсяму медперсаналу, які працаваў у свята, і адзначалі, наколькі ўважлівa і па-добраму ставіліся да парадзіх і як ім пашанцавала апынуцца ў яго руках.

Кацярына РАК нарадзіла сваю першую дачку:

— Планавы тэрмін быў прызначаны на 29 чэрвеня, аднак яна захацела нарадзіцца 3 ліпеня. Днём я яшчэ схадзіла на прагулку на вуліцу, дзе пачаліся схваткі, а ўжо ў 23:30 я нарадзіла, так што як раз паспела на свята. Цяпер у дачкі заўжды будзе гэты дзень выхадным і да дня яе нараджэння — салют. Так што я вельмі рада, што яна выбрала такі час.

Святам і нечаканасцю ў Дзень Незалежнасці стала нараджэнне трэцяга сына (старэйшаму 17 ліпеня споўніцца 12 гадоў, сярэдняму сёння дзевяць месяцаў) для Настассі НЕВІДОВІЧ, якая планавала прыбаўленне ў сям'і крыху пазней. Цімафей, дарэчы, стаў першым немаўлём, якое нарадзілася ў знамянальны дзень у сталіцы:

— Я і не паспела заўважыць, што было свята. Знаходзілася дома з малодшым сынам, калі адышлі воды. На машыне хуткай дапамогі паехала ў бальніцу, і ўжо а палове першай з'явіўся мой сынок. Цяпер у нас у сям'і будзе падвойнае свята.

Незабыўным 3 ліпеня стала і для Святланы Кавалеўскай-Музыкантавай, якая нарадзіла двух хлопчыкаў, а дома матулю чакае старэйшы 11-гадовы сынок. Алена Зайцава нарадзіла ў свята сваё восьмае дзіця (цяпер у яе пяць хлопчыкаў і тры дзяўчынкі), а Вольга Заяц — чацвёртае. Настасся Вярнеева, Жанна Піскур, Юлія Порах і Вольга Скроб сёлета прыйшлі ў раддом па сваіх другіх дзяцей — сыноў.


Фота аўтара.

У краіне робіцца шмат, каб дзеткам жылося ў ёй добра, а іх будучыня была яркай і светлай. Сем'і, якія выхоўваюць дзяцей, аказваецца 11 відаў розных дапамог, працуюць гурткі, будуюцца школы.

— Мы заўжды вельмі рады, калі сем'і вырашаюць нараджаць дзяцей і калі гэтыя малыя жаданыя. Сем'і, якія не жадаюць мець дзяцей, — чайлдфры — гэта не нашы традыцыйныя каштоўнасці. У нашых традыцыйных каштоўнасцях — сям'я, якая выхоўвае дзяцей. Гэта мама і тата, нараджэнне чаканага і жаданага дзіцяці, і гэта правільна. Усё астатняе — надуманыя павевы і плыні і яны не для Беларусі. Калі нарадзіць перашкаджае стан здароўя, то на дапамогу прыходзяць новыя тэхналогіі. У прыватнасці, першае бясплатнае ЭКА для жанчыны, — заўважыла Наталля Качанава.

Спікер паведаміла, што ў Савеце Рэспублікі з удзелам праваслаўнай царквы плануецца маштабнае мерапрыемства, якое будзе прысвечана сямейным каштоўнасцям. Падчас яго мяркуецца на дакладных жыццёвых прыкладах паказаць важную і асноўную місію чалавека на зямлі — працяг роду.

**Ірына СІДАРОК.**

Фестывалім

# У АТМАСФЕРЫ ТВОРЧАСЦІ І МІЖНАРОДНАГА СЯБРОЎСТВА

**Каля 30 краін і больш за 5000 удзельнікаў рыхтуецца прыняць ХХХІІ Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», які чарговы раз пройдзе з 12 да 17 ліпеня. Арганізатары і прадстаўнікі Міністэрства культуры, рэжысёры галоўных мерапрыемстваў на сустрэчы з журналістамі распавялі, як ідзе падрыхтоўка да культурнага форуму і чым ён будзе адметны сёлета.**

— Праводзячы такі буйны маштабны праект, дэвіз якога «Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення», мы выступаем свайго роду міратворцамі. Бо правядзенне фестывалю спрыяе яднанню народаў, міру ва ўсіх краінах постсавецкай прасторы і ва ўсім свеце, — адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Іна АДАМОВІЧ.** — Што датычыцца «Славянскага базару», то асноўныя мерапрыемствы — гэта цырымонія адкрыцця, гала-канцэрты адкрыцця і закрыцця фестывалю, міжнародныя конкурсы, мерапрыемствы Саюзнай дзяржавы з правядзеннем канцэрта «Саюзная дзяржава запрашае» 14 ліпеня, а таксама такіх буйных праектаў, як канцэрт харэаграфічнага мастацтва ў КЗ «Віцебск» і канцэрт опернага мастацтва на базе Віцебскай абласной філармоніі.

Адкрыццё адбудзецца 13 ліпеня ў 21.00 у Летнім амфітэатры. У рамках гэтага мерапрыемства пройдзе ўручэнне спецыяльнай узнагароды «Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення» і прыза ўладальніку Гран-пры Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск 2023». Варта адзначыць, што міжнародныя конкурсы стартуюць ужо 11 ліпеня. Беларусь на іх будуць прадстаўляць Сафія Рустамава з Брэста і Самір Елчыеў з Оршы.

У рамках фестывалю ўпершыню пройдуць сольныя канцэртныя праграмы беларускіх артыстаў. Адкрыецца «Славянскі базар» канцэртам «Мір нашаму дому» гурта «Аўра» і запрошаных гасцей, прымеркаваным да Году міру і стваральнай працы і юбілею калектыву. А другая сольная праграма адбудзецца ў рамках Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні ў Летнім амфітэатры 15 ліпеня — канцэрт заслужанай артысткі Беларусі Ірыны Дарафеевай «На крылах мары».

У рамках культурнага форуму таксама шырока прадстаўяць і тэатральную праграму. Так, напрыклад, 13 ліпеня на базе Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа пакажуць прэм'ерны спектакль Маладзёжнага тэатра эстрады — мюзіклбіяграфію «Гур'янаў». А 15 ліпеня пройдзе мюзікл «Граф Монтэ-Крыста» ад Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Як заўсёды, публіку будуць здзіўляць канцэртныя праграмы адкрыцця і закрыцця фестывалю.

— Цырымонія адкрыцця «Славянскага базару» — гэта незвычайны праект, таму што збіраюцца самыя лепшыя і вядомыя артысты, унікальныя калектывы. У сцэнічным афармленні мы працягваем эксперыментаваць і працягваем ідэю трансфармацыі сцэны для таго, каб артыст мог быць максімальна блізкі да гледача. Адпаведна ў нас будзе працяг леташняга подыума, але ў іншай канфігурацыі і з іншымі тэхнічнымі асаблівасцямі, — падзялілася **Агата МАЦКО, рэжысёр урачыстага адкрыцця ХХХІІ Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».** — У аснове самой праграмы — ідэя мастацтва міру і ўзаемаразумення. Ёсць у нас галоўная фішка сёлетняй цырымоніі — мы абсалютна памянялі фармат вядучых. Незвычайная будзе і музычная праграма, дзе адзін з цэнтральных блокаў прысвечаны вядомым кампазітарам, песням, якія ў гэтым годзе адзначаюць юбілейныя даты. Цэнтральнай фігурай там стане асоба Ігара Лучанка.

**Рэжысёр Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2023» і ўрачыстага закрыцця фестывалю Марына РАМАНОЎСКАЯ** распавяла пра тое, што творчае спаборніцтва маладых выканаўцаў пройдзе ў традыцыйным фармаце. Жараб'ёўка сёлетніх конкурсаў адбудзецца ў прэс-цэнтры фестывалю, і ўпершыню канкурсантам прапануюць выбраць асобна нумары на кожны дзень спаборніцтва.

— На канцэрце закрыцця ўсе конкурсныя выступленні будуць мець, акрамя харэаграфічнага афармлення, яшчэ і аздабленне тэхнічнае з выкарыстаннем аб'ёмных дэкарацый. І адпаведна кожны нумар набудзе сваю атмасферу, — кажа Марына Раманоўская.

Што датычыцца арганізацыйных момантаў, то іх акрэсліў **Глеб ЛАПІЦКІ, дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»:**

— Ужо 3 ліпеня адбыўся заезд першых дэкарацый. Цяпер ідзе актыўная работа тэхнічных службаў і службы бяспекі. Усе рыхтуюцца, і гэта пацвярджае, што «Славянскі базар» — не толькі праект, які мае творчы складнік, але і буйны механізм, які кантралюецца на ўзроўні дзяржавы. І сёння наш фестываль унікальны таму, што з'яўляецца адзіным культурным форумам у свеце, які 32 гады няспынна праводзіцца і адпавядае свайму дэвізу. Чакаем сёлета гасцей і артыстаў, якія з намі падзяляюць гэтую пазіцыю. Калі вы за творчасць і за мастацтва, то вам да нас.

Дастаўкай удзельнікаў і гасцей фестывалю будзе займацца пераважна Беларуская чыгунка. Так, сёлета ўпершыню пачне курсіраваць спецыяльны цягнік «Віцебск — Масква». Арганізатары такім чынам спрабуюць вырашыць адну з важных тэм, якая датычыцца размяшчэння на начлег гасцей фестывалю. Квіткі на галоўныя мерапрыемствы таксама ўжо амаль распрададзены.

**Алена ДРАПКО.**

# Прапанова значна перавышае попыт



## КОЛЬКАСЦЬ АБ'ЕКТАЎ НА ПРОДАЖ ЗАШКАЛЬВАЕ

Прапанова на рынку загараднай нерухомасці расце ўжо чацвёрты месяц запар, адзначаюць эксперты рэспубліканскага жыллёвага партала Realt. У маі колькасць выстаўленых на продаж аб'ектаў дасягнула 9,3 тысячы (+5,4 %), што з'яўляецца новым гістарычным максімумам. Таксама бягучы ўзровень прапановы на 13,5 % большы, чым за такі ж час летась. У найбліжэйшы час сезонны фактар пачне ўплываць на дынаміку прапановы — звычайна ўжо ў чэрвені аб'ектаў на рынку загараднай нерухомасці становіцца менш. Але сёлета існуюць пэўныя нюансы, якія паказваюць, што прапанова будзе расці ўсё лета.

Аналітыкі партала заўважылі, што сярод аб'ектаў загараднай нерухомасці рост колькасці аб'яў у маі быў раўнамерны. Так, колькасць дач павялічылася амаль на 7 %, «сучасных» і «старых» дамоў і ўчасткаў — на 5 % ва ўсіх выпадках, недабудаваных — на 4 %.

У разрэзе напрамкаў (ад Мінска) прапанова павялічылася ва ўсіх выпадках. Істотней за ўсё на Мядзельскім і Брэсцкім кірунках — плюс 8 % і 7 % адпаведна. Крыху менш (+6 %) — на Лагойскім, Магілёўскім і Пухавіцкім.

## МАЙСКАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

Паводле папярэдніх даных агульная колькасць здзелак з дамамі ў Мінску і Мінскай вобласці ў маі склала 861, што амаль на 30 % больш, чым у мінулым месяцы. Гэтыя лічбы паказваюць не рэальную актыўнасць на рынку, а толькі тое, што ў красавіку патэнцыяльныя пакупнікі яшчэ не «прачнуліся». Нягледзячы на майскую актыўнасць, сукупны попыт на загарадную нерухомасць гэтай вясной застаўся на такім жа ўзроўні, як і ў мінулым годзе.

Такім чынам, у Мінскім раёне за май было праведзена 150 здзелак куплі-продажы, што на 19 % больш, чым у папярэднім месяцы, і на 8 % больш, чым у мінулым годзе. У найбліжэйшых раёнах за месяц было заключана 392 здзелкі, што на 30,5 % больш, чым месяцам раней. Аднак бягучы ўзровень попыту на 2 % ніжэйшы, чым у маі 2022 года. Да найбліжэйшых рэгіёнаў адносяцца Лагойскі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Дзяржынскі, Уздзенскі, Маладзечанскі, Вілейскі і Валожынскі.

## РОЗНАЯ ДЫНАМІКА

Дынаміка сярэдніх цэн у залежнасці ад тыпаў аб'ектаў у маі была рознанакіраванай. Злёгку падаражэлі недабудаваныя дамы і ўчасткі. А сучасныя і старыя дамы сталі таннейшымі. Дачныя домікі ў мінулым месяцы патаннелі мацней за ўсё — адразу на 4,5 %. Старыя дамы за год страцілі ў цане амаль 6 %.

Цяпер мы разгледзім рынак індывідуальных жылых дамоў сталіцы. Як правіла, апошнім часам прадавалі выключна бюджэтныя прыватныя дамы.

Па папярэдніх даных у сталіцы было праведзена 11 здзелак куплі-продажу па такіх аб'ектах, а колькасць дамоў, выстаўленых на продаж у Мінску, за месяц павялічылася на 2 %. У той жа час сярэдняя цана квадратнага метра дамоў у межах горада зніжаецца ўжо 4 месяц запар: у маі яна знізілася яшчэ на 0,6 %. На дадзены момант яе велічыня складае 1064 долары ў эквіваленце.

Дарэчы, самы дарагі дом, набыты ў маі гэтага года, абышоўся пакупніку ў 390 тысяч долараў. Гэта досыць «свежы» жылы дом, які быў пабудаваны ў 2020 годзе ў ВК «Зялёная гавань». Агульная плошча двухузроўневага дома складае 238,4 квадратнага метра, участка — 9,6 соткі. На першым паверсе дома размешчана кухнягасцёўня плошчай 77,5 квадратнага метра з выхадам на тэрасу, таксама жылы пакой, гардэробная, кацельня, гасцявы санвузел і саўна з пакоем адпачынку.

Першы паверх ацяпляецца з дапамогай цёплай падлогі і канвектараў, другі — радыятарамі і канвектарамі. На другім паверсе жылыя пакоі, два санвузлы і дзве тэрасы плошчай 57 і 6,8 квадратнага метра, з якіх адкрываецца від на ўнутраны двор. Усяго за метр выходзіць каля 1635 долараў.

## ВОЗЕРА, ДЖАКУЗІ І БІЛЬЯРД

Нядаўна мы дэталёва разбіралі, якія кватэры здаваліся гэтай вясной у арэнду. Цяпер паглядзім, што адбываецца з дачамі і дамамі ў Мінску і Мінскай вобласці. У якіх месцах больш за ўсё дамоў у арэнду? Як змяніліся прапанова і цэны?

З прыходам сапраўднага цяпла пачынаецца актыўны сезон арэнды дач і дамоў, які доўжыцца да канца лета. Пачынаючы з сакавіка пошукавая актыўнасць дамоў і дач у доўгатэрміновую арэнду пастаянна расце. Разам з гэтым павялічваецца і канкурэнцыя сярод арэндадаўцаў. Пік прапановы дамоў у гэтым годзе прыйшоўся на красавік, калі свабоднымі для засялення былі 325 аб'ектаў, у маі ўжо на 2 % менш. Тым не менш выбар жылля гэтай вясной быў на 5 % большы, чым у мінулым годзе, лічаць аналітыкі.

Самы вялікі выбар арэндных дамоў засяроджаны ў 4 населеных пунктах. У Мінску размешчана 15 % усёй прапановы (або 46 дамоў), прыгэтым больш за ўсё аб'ектаў прыпадае на мікрараёны Цнянка і Сельгаспасёлак. Таксама па 4 % ад усіх аб'ектаў знаходзіцца ў Калодзішчах, Бараўлянах і Ратамцы.

Самым шматлікім напрамкам з'яўляецца Лагойскі, дзе засяроджана 23 % прапановы. Крыху меншыя па выбары — Маскоўскі (17 %) і Маладзечанскі (13 %). Менш за ўсё здаецца дамоў у арэнду на Слуцкім напрамку — усяго 2 %.

Часцей за ўсё арэндадаўцы ў апісанні аб'явы паказваюць аб наяўнасці халадзільніка, мэблі, тэлевізара і месца для шашлыкоў. Радзей адзначаюць наяўнасць інтэрнэту і побач размешчанага лесу. Возера непадалёк ад дома згадваецца ў 32 % аб'яў. Такія атрыбуты, як джакузі, настольны тэніс і більярд, сустракаюцца толькі ў 6 % выпадкаў.

Пры бюджэце да 500 долараў можна разлічваць толькі на арэнду дома за рысай горада. Год таму ў сталіцы было некалькі варыянтаў з такім бюджэтам, сёння ж цэны стартуюць з 550 умоўных адзінак, прычым за такую цану быў размешчаны толькі адзін аб'ект. Больш за ўсё сталічных дамоў здаецца за 1000—2000 долараў у месяц, у той час як у большай палове прапановы за межамі горада запытаная цана ўказана да 1000 долараў.

Калі паглядзець у разрэзе напрамкаў, то на Пухавіцкім у пераважнай большасці знаходзяцца бюджэтныя дамы, дзе цэннік да 400 долараў. Пакуль на Лагойскім напрамку палова ўсіх дамоў здаецца ў арэнду ад 1500 долараў. За год цана арэнды дамоў вырасла, як у сталіцы, так і за яе межамі. Сярэдняя цана арэнды ў маі 2023 года ў Мінску вызначылася на ўзроўні 2600 долараў, што на 9 % больш, чым годам раней. У Мінскай вобласці сярэднеўзважаная арэндная стаўка якасных дамоў склала 1100 долараў — плюс 6 % да мая мінулага года.

## ГЕАГРАФІЯ ТАННЫХ ЛЕЦІШЧАЎ

Цэннікі ў новых аб'явах аб памесячнай арэндзе самых танных лецішчаў паблізу Мінска пачынаюцца з 300 рублёў, або 100 долараў у эквіваленце. І гэта даволі прыстойнае жыллё, калі меркаваць па апісаннях. За такую штомесячную суму можна было, напрыклад, забраніраваць на лета 2023 года лецішча ў садовым таварыстве па Брэсцкім напрамку за 30 кіламетраў ад МКАД (Дзяржынскі раён). Невялікі драўляны дом мае два ўзроўні і тры пакоі. Ёсць кухня, халадзільнік, электраплітa, інтэрнэт, але душ і туалет на вуліцы. На ўчастку таксама ёсць альтанка і калодзеж.

Агульнае правіла нязменнае: чым зручней выглядае і размешчаны дом, тым даражэйшая яго арэнда. Для дач гэта таксама справядліва. Так, цагляная дача з паметкай «здам на лета 2023 года» па Маскоўскім напрамку за 25 кіламетраў ад МКАД (Смалявіцкі раён) мае электрычнае ацяпленне, цэнтральную каналізацыю, гарачую ваду і газавую пліту. Сярод іншых выгод названыя камін, тэлевізар, халадзільнік і інтэрнэт.

У доме агульнай плошчай 80 квадратных метраў (кухня — 12 «квадратаў») налічваецца два ўзроўні і чатыры пакоі. На васьмі сотках знайшлося месца для двух паркавачных месцаў. Каля дачы працякае рака. Недалёка высіцца Курган Славы, а за ім пачынаецца ландшафтны заказнік «Прылепскі». Дача такога плана ў новым сезоне абыдзецца арандатару прыкладна ў 400 долараў. Зняць яе можна адразу на некалькі летніх месяцаў. На рынку ёсць падобныя прапановы, якія абыдуцца на 80—120 долараў танней. Часцяком менавіта такія дачы па суадносінах кошт — якасць актуальныя для сям'яў з зусім маленькімі дзецьмі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дзень Незалежнасці ў ЗША адзначыўся шматлікімі ахвярамі




У Вашынгтоне падчас святкавання Дня Незалежнасці ЗША адбылася стральба, раненні атрымалі дзевяць чалавек. Пра гэта паведаміла Fox News са спасылкай на інфармацыю памочніка начальніка сталічнай паліцыі Леслі Парсанса. Паводле даных праваахоўнікаў, падчас свята пазадарожнік чорнага колеру спыніўся і пачалася стральба па людзях, якія адпачывалі. Адзначаецца, што двое з пацярпелых — непаўналетнія. За апошнія некалькі дзён у выніку стральбы ў Пенсільваніі, Тэхасе, Мэрылендзе і Канзасе як мінімум дзевяць чалавек загінулі, дзясяткі атрымалі раненні. Згодна са статыстыкай, па стане на сярэдзіну чэрвеня ў ЗША адбылася найбольшая колькасць масавых забойстваў і смерцяў у параўнанні з такім жа перыядам у папярэднія гады. Як піша Politico, Джо Байдэн, калі краіна святкавала Дзень Незалежнасці, зноў заклікаў да далейшых абмежаванняў на нашэнне зброі пасля шэрагу смяротных перастрэлак. Ён таксама спаслаўся на леташнія падзеі 4 ліпеня, калі ўзброены злачынец у Хайленд-Парку (прыгарад Чыкага) забіў з аўтамата сем чалавек падчас святочнага парада.

### 3 ліпеня стаў самым спякотным днём на планеце ў гісторыі назіранняў



Сярэдняя тэмпература на ўсёй планеце пабіла рэкорд, устаноўлены сем гадоў таму. Як абвясцілі навукоўцы з амерыканскай урадавай установы «Нацыянальныя цэнтры прагназавання навакольнага асяроддзя», 3 ліпеня сярэднесусветная тэмпература дасягнула 17,01 градуса па Цэльсію. Раней шы рэкорд, зафіксаваны ў жніўні 2016-га, складаў 16,92 градуса. Навукоўцы ўдакладняюць, што гэта рэкорд і за ўсю гісторыю рэгулярных навуковых назіранняў, якія вядуцца з канца XIX стагоддзя. Чэрвень гэтага года стаў, паводле падлікаў метэаролагаў, самым цёплым месяцам на планеце за ўсю гісторыю назіранняў. Навукоўцы мяркуюць, што ўсталяванню новых тэмпературных рэкордаў спрыяе спалучэнне агульнай змены клімату з-за выкідаў парніковых газаў і пачатку прыроднай з'явы Эль-Ніньё.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь Аляксея Мікалаевіча АЎРАМЕНКІ ў сувязі з яго раптоўнай смерцю.**

**Глыбока ўзрушаны заўчасным сыходам з жыцця дзяржаўнага дзеяча, сапраўднага прафесіянала і патрыёта сваёй Айчыны, глыбока прыстойнага, працавітага, добрасумленнага і адказнага чалавека. Пад яго кіраўніцтвам дынамічна развіваўся транспартны комплекс краіны, што садзейнічала ўмацаванню эканоміка-сацыяльнай інфраструктуры, забеспячэнню жыццядзейнасці ўсіх галін эканомікі і нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.**

**Смуткуем і падзяляем горыч гэтай незаменнай страты. Светлая памяць пра Аляксея Мікалаевіча назаўжды захаваецца ў нашых сэрцах.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь Аляксея Мікалаевіча АЎРАМЕНКІ ў сувязі з яго раптоўнай смерцю.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім міністра транспарту і камунікацый Беларусі Аляксея АЎРАМЕНКІ з прычыны яго раптоўнай смерці.**

**Добрая памяць пра Аляксея Мікалаевіча назаўжды захаваецца ў памяці блізкіх, сяброў і калег.**

**Кіраўніцтва і калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказваюць шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь Аляксея Мікалаевіча АЎРАМЕНКІ ў сувязі з яго раптоўным сыходам з жыцця.**

**Падзяляем з вамі гэты горкі боль незаменнай страты выдатнага чалавека, сапраўднага прафесіянала і калегі. Светлая памяць!**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь Аляксея Мікалаевіча АЎРАМЕНКІ ў сувязі з яго раптоўнай смерцю.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
6 ЛІПЕНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15957)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Карына ЕРАФЕЕВА:

# «Х-Фактар» даў мне сілу і веру ў сябе»



**Можна не з першай спробы знайсці сябе, але набыць каштоўны вопыт. Можна сумнявацца, адчуваць зняверанасць, але рызыкнуць і зрабіць новы крок. І гэта я не філасофствую, а коратка апісваю артыстку тэлепраекта «Х-Фактар. Беларусь» Карыну Ерафееву. Сёння яна ўжо смела заяўляе, што верыць у свае сілы і сама сабе — найлепшы абярэг. Мы сустрэліся з маладой спявачкай, каб пагутарыць пра яе характар, мары і арыенціры на найбліжэйшую будучыню.**

***— Карына, скажыце, калі вы зразумелі, што быць артысткай для вас — правільны выбар у жыцці?***

— Я з самага дзяцінства, колькі сябе памятаю, была ў музыцы. З трох гадоў пачала займацца народнай музыкай (у мяне быў садок з музычным ухілам), а ўжо ў пятым класе з'явілася эстрада. Пасля паступіла на акадэмічныя спевы. Па сутнасці, спявала ўвесь час. І ніколі не задумвалася, ці правільны гэта для мяне выбар. Проста ведаю: мне трэба рухацца ў гэтым напрамку. Думаю, што гэта добра. Таму што ў людзей бываюць моманты сумненняў, пошукаў сябе. А я заўсёды цвёрда ведала, што маё жыццё без сцэны не будзе мець сэнсу.

***— Лічыце, што «Х-Фактар» стаў нейкай незваротнай кропкай у вашым развіцці ў музыцы?***

— Так, паколькі да гэтага праекта ўсё было нібыта на ўзроўні самадзейнасці. Да паступлення ў музычны каледж я ўдзельнічала ў разнастайных конкурсах, але з тэлевізійных быў толькі «Талент краіны». А потым узнікла часовае зацішша з музыкай. Гэта сказалася на маёй самаацэнцы. У той перыяд я таксама ўсвядоміла, што будзе, калі сыду з абранага шляху. Магла проста ісці па вуліцы, пабачыць артыстаў на сцэне і расплакацца. Хацця я тады ўжо вучылася на рэжысёра. А калі мне патэлефанавалі перад кастынгамі «Х-Фактару», зразумела, што трэба вяртацца. Вядома, былі сумненні, ці варта зноў выходзіць на сцэну, але я паехала на праслухоўванні і там адчула, што жыву музыкай.

***— Трапіць у каманду да Сяргея Саседава — удача для артыста-пачаткоўца?***

— Проста трапіць на «Х-Фактар» — ужо вялікая ўдача для артыста. А што датычыцца педагогаў, то там усе яны — не выпадковыя людзі. Сярога, Вольга Бузава, Руслан Аляхно, Сяргей Саседаў — кожны з іх паважаны артыст. Мы маглі толькі марыць, што зможам кантактаваць з прафесіяналамі такога ўзроўню. Але, трапіўшы на праект, я гатова была пайсці да каго заўгодна, толькі не да Сяргея Васілевіча. Бо разумела, што той стыль, з якім прыйшла на праект, і тое, што падабаецца гэтаму настаўніку, — рэчы несумяшчальныя. А пазней на этапе крэслаў падумала: калі мяне не возьме Саседаў, то забярэ Бузава, якой я імпанавала як артыстка. Аднак у выніку аказалася ў Сяргея Васілевіча. І наша супрацоўніцтва паказала, што я ўмею знаходзіць агульную мову з іншымі людзьмі. Мы нават да сёння падтрымліваем сувязь.

***— Глядзіце, некаторыя моманты, якія характарызуюць вас, паказалі ў эфіры, а іншыя засталіся за кадрам. Што даў вам «Х-Фактар», калі казаць пра вопыт чалавечых узаемазносін?***

— Мне гэты праект даў сілу. На той момант я сустракалася з маладым чалавекам. І, паколькі спыніла сваё развіццё ў музыцы, вельмі паглыбілася ў нашы адносіны, усклала на яго свае надзеі на будучыню. У выніку стала вельмі залежнай ад чалавека і сваіх пачуццяў да яго. Таму ў пачатку праекта мне было складана. Я ж адна, і побач няма нікога. А ўжо на «Х-Фактары» стала ўсведамляць, што нашы адносіны — падманлівая гісторыя, і ў выніку мы разышліся. Калі б не праца на праекце і далейшае супрацоўніцтва з прадзюсарскай кампаніяй, то разрыў перажывала б балюча. А ў творчасці адшукала вялікую сілу ў сабе як у асобе і артыстцы.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Свой выбар

# «КАЛІ ГЭТА ТВАЁ, ТО ЯНО ЦЯБЕ ЗАЦЯГНЕ»

## Урач выязной брыгады аб працы на «хуткай»



**Нашай суразмоўніцы Аляксандры ПЕРМЯКОВАЙ 25 гадоў. Яна скончыла Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт у 2021 годзе і ўжо год працуе ўрачом на станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Кобрынскай ЦРБ. У школе многія прадметы ў яе ішлі добра: і фізіка, і матэматыка, і хімія, і біялогія. Вырашальным стаў выпадак. На адным з сямейных свят нехта сказаў, што Саша вельмі падобная на лекара. Дзяўчыне гэтая ідэя спадабалася, з таго часу і пачаўся яе шлях у медыцыну.**

У Аляксандры было мэтавае накіраванне на Брэсцкую вобласць. На шостым курсе яна была па субардынатуры ўрачом агульнай практыкі і ўжо маральна рыхтавалася працаваць у паліклініцы або ў амбулаторыі. Аднак на размеркаванні аказалася, што яе месца ў Маларыце ўжо занятае, і Аляксандру накіравалі ў Кобрынскую ЦРБ, дзе патрабаваліся ўрачы выязной брыгады.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Трэці працоўны

# СТУДАТРАДЫ, НА СТАРТ!

**Нягледзячы на магчымасць, прадстаўленую дзяржавай, — працаваць у студэнцкіх атрадах у вольны ад вучобы час цэлы год, — асноўным перыядам з'яўляецца так званы трэці працоўны семестр — самы доўгачаканы ў жыцці студэнтаў. Экзамен у гэтым семестры — адзін з самых складаных: іспыт на сталасць, адказнасць, працавітасць.**



**Неабходна адзначыць, што масава студэнцкія атрады пачнуць работу з 3 ліпеня, пасля здачы летняй экзаменацыйнай сесіі.**

**Штогод удзельнікі руху збіраюць ураджай, даглядаюць дзяцей у дзіцячых аздараўленчых лагерах, добраўпарадкоўваюць тэрыторыі помнікаў воінскай славы, месцаў масавых пахаванняў, тэрыторый населеных пунктаў, водаахоўных зон і прыбярэжных палос водных аб'ектаў, паркаў, аб'ектаў культурна-гістарычнай і духоўнай спадчыны.**

**Геаграфія працы Беларускіх студэнцкіх атрадаў пашыраецца з кожным годам. Яны даўно перасягнулі межы Беларусі, нашы студэнты працавалі ў студатрадах розных профіляў ад Венесуэлы да Крайняй Поўначы. А што чакае байцоў сёлета і ў найбліжэйшай перспектыве?**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# СТУДАТРАДЫ, НА СТАРТ!



### Новы напрамак — Узбекістан і Кітай

**Студэнцкія атрады Беларусі плануюць сумесныя праекты з моладдзю Узбекістана і Кітая. Аб гэтым паведаміў першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў у праекце БелТА «Па факце: рашэнні Першага».**

Ён нагадаў, што ў савецкі час студатрадаўскі рух крочыў шырока па краіне, і хлопцы і дзяўчаты з розных рэгіёнаў вялікай краіны працавалі на такіх магутных праектах, як будоўля Байкала-Амурскай магістралі, шчыравалі ў Кузбасе, на Далёкім Усходзе, у Краснадарскім краі.

Цяпер рух студатрадаў грунтуецца на асновах, закладзеных у той час, але падаецца пад новымі, крэатыўнымі ідэямі. З Расіяй у гэтых адносінах выбудавана шчыльнае ўзаемадзеянне, там ёсць сістэмная работа, функцыянуюць расійскія студатрады, з якімі ў беларускага боку падпісаны адпаведныя пагадненні. На штогадовай сталай аснове ідуць абмены.

У цэлым развіццё міжнароднага напрамку ўяўляецца вельмі цікавым, упэўнены Аляксандр Лук'янаў. Напрыклад, досвед Беларусі вельмі цікавы Узбекістану. «Ужо не на бягучы год, хутчэй за ўсё, гэта будзе постюбілейны 61-ы год, мы будзем узаемадзейнічаць з Узбекістанам», — сказаў першы сакратар БРСМ.

Ёсць цікавасць і да такіх праектаў з Кітаем. Там ёсць кірунак, падобны на студатрадаўскі рух. «У гэтых адносінах мы гатовы прапрацаваць пытанне, каб у нас з'явіліся і такія сумесныя праекты», — дадаў Аляксандр Лук'янаў.

### Атрымаць рабочую спецыяльнасць

**Дзяржава праз Саюз моладзі дае студэнтам ВНУ ўнікальную магчымасць бясплатна атрымаць у вольны ад вучобы час дадатковую рабочую спецыяльнасць і прафесію, заявіў у прэс-цэнтры БелТА другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр Прохараў.**

Паводле яго слоў, Саюз моладзі сумесна з міністэрствамі адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, прамысловасці прапрацаваў праграму практыкаарыентаваных кароткатэрміновых курсаў на атрыманне рабочай спецыяльнасці. «І магу сёння заявіць, што каля 250 чалавек у нас ужо атрымалі пасведчанне аб рабочай спецыяльнасці. І, што яшчэ вельмі важна, гэтыя хлопцы і дзяўчаты будуць гарантавана працаўладкаваны ў складзе студэнцкіх атрадаў. Гэта праваднікі пасажырскага вагона, манцёры пуцей, слесары механазборачных работ і аператары станкоў з праграмным кіраваннем».

Другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ расказаў і аб заработнай плаце байцоў студатрадаў. «Яна дастойная. Памер залежыць ад профілю атрада, ад колькасці адпрацаваных дзён у атрадзе, ад узроставых асаблівасцяў. Таму заробак — розны. У цэлым я магу сказаць, што зарплата на рэспубліканскім працоўным праекце — ад 800 да 850 рублёў і даходзіць да дзвюх тысяч за месяц паўнацэннай работы». Але ніхто моладзі гэты заробак проста не дае. Яна яе зарабляе сваёй працай, уносіць рэальны ўклад у ВУП краіны, як бы гучна гэта ні гучала», — падкрэсліў Аляксандр Прохараў.

### На «Атлант» прыязджаюць зараджанымі

**Працоўны праект «Атлант» аб'яднае сёлета 12 студатрадаў з усёй краіны, расказала камандзір Маладзёжнага вытворчага працоўнага праекта «Атлант», экс-камісар Усебеларускай маладзёжнай будоўлі «Горад маладосці» Крысціна Хубулава.**

«Чацвёрты год наш праект жыве і працягвае развівацца на заводзе, які мы вельмі любім. У нас будзе 12 атрадаў — 205 чалавек з усёй краіны. Гэта прадстаўнікі Мінска, Гродна, Магілёва, Наваполацка. І вельмі многія студатрады будуць ужо не ўпершыню. У нас праходзіць сур'ёзны адбор, паступае вельмі шмат заявак, і даводзіцца адбіраць самых дастойных, самых лепшых, каб мы паказалі ўсю моц нашых атрадаў, што яны могуць не толькі працаваць, але яшчэ і паказваць розныя творчыя навыкі», — расказала Крысціна Хубулава.

Паводле яе слоў, байцы прыязджаюць заўсёды вельмі зараджанымі. «У гэтым годзе ў нас яшчэ такая «фішка»: 100 чалавек будуць збіраць халадзільнікі, а яшчэ 100 чалавек — пральныя машыны. Байцы таксама атрымліваюць прафесію слесара-зборшчыка падчас таго, як працуюць. Гэта вельмі зручна і дазваляе потым студэнтам дадаткова падзарабляць на заводах у вольны ад вучобы час.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота БелТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Бачыць мэту*

# Жыццё без адходаў,

## або Спажываць толькі тое, што сапраўды патрэбна

**У дзяцінстве яна хацела стаць урачом і лічыла, што такі занятак павінен прыносіць задавальненне і карысць для свету і грамадства. Праз гады дзяўчына думае, што з яе сапраўды мог бы атрымацца цудоўны ўрач. Аднак перамагла прафесія эколага: на момант паступлення ва ўніверсітэт спецыяльнасць была адносна новай і здавалася цікавай. Цяпер наша гераіня нават у дэкрэтным водпуску не кідае чытаць лекцыі па экалогіі на прадпрыемствах, ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях, актыўна вядзе ўласны блог у «Інстаграме», пастаянна павышае сваю кваліфікацыю. «Чырвонка. Чырвоная змена» завітала да Ірыны САКОВІЧ — эксперта ў галіне экалогіі, кансультанта па ахове навакольнага асяроддзя, каб спытаць, што трэба рабіць, каб паменшыць колькасць непатрэбных рэчаў ва ўласным жыцці, чаму рух zero waste («нуль адходаў») сёння такі папулярны і як можна павысіць сваю экакультуру.**



### Сучасны маладзёжны трэнд

— Несумненна, сёння экалагічны трэнд распаўсюджаны, асабліва сярод маладых людзей. Менавіта яны ствараюць такі запыт. Апошнім часам востра запатрабаваныя лекцыі практычнага характару, якія датычацца ўкаранення ў сваім жыцці пэўных экалагічных звычак. Са студэнтамі ва ўніверсітэтах мы распрацоўваем ідэі ўвасаблення эксасацыяльных ініцыятыў. Сярод дзяўчат, напрыклад, карыстаецца папулярнасцю тэма экалагізацыі побыту: як выбраць больш экалагічную бытавую хімію, натуральную касметыку, хвалююць пытанні экаманцырынства. Маладых людзей турбуе раздзельны збор смецця, «разумнае спажыванне» і тэма мінімалізму.

Эколаг занепакоена тым, наколькі шмат у нашым побыце рэчаў, якія засмечваюць прастору: аднаразовыя пакеты, прадметы гігіены — ватныя дыскі, палачкі, памперсы і іншае. Самы яркі прыклад — поліэтыленавы пакет. Замест яго, раіць Ірына, можна выкарыстоўваць шматразовы шопер з тканіны альбо авоську. Ірына неаднаразова пісала звароты ў дастаўку адной буйной гандлёвай сеткі аб змяненні колькасці пластыкавай упакоўкі і поліэтыленавых пакетаў.

— На ўсё гэта цяпер існуе мода, і моладзь з'яўляецца рухавіком прынцыпу «разумнага спажывання», — расказвае эксперт. — Маладыя людзі актыўна выкарыстоўваюць шматразовыя рэчы ў сваім жыцці, я гэта заўважаю і на вуліцы, і ў краме, і па відэа на YouTube, дзе ўсё часцей дзеляцца парадамі, як абыходзіцца толькі самым неабходным, пазбаўляючы сваю ўласную прастору ад усяго лішняга.

У краме трэба аддаваць перавагу таварам з экалагічнымі сертыфікатамі. А міжнародны мабільны дадатак Ecolabel Guide з функцыяй распазнавання экамаркіровак на ўпакоўках, які быў распрацаваны Расійскім экалагічным саюзам, дазволіць выбіраць экатавары і не памыляцца. Такім чынам можна ўбачыць, што вялікая іх колькасць мае так званыя несапраўдныя сертыфікаты, напрыклад, проста адмаляваныя дызайнерамі экназначкі. Самымі распаўсюджанымі экалагічнымі сертыфікатамі з'яўляюцца «Лісток жыцця», «EU Ecolabel», «Ecocert», «ICEA», «Cradle to Cradle» і іншыя.

Што датычыцца руху zero waste, то ён пачаў развівацца з падачы нашых некамерцыйных арганізацый, якія вядуць інфармацыйную работу з грамадствам. На працягу апошніх гадоў я сапраўды бачу, што пачаў з'яўляцца запыт з боку апошняга і, адпаведна, інфраструктура. Адкрываюцца крамы з падыходам «нуль адходаў». Там укаранілі экалагічныя прынцыпы ў сваю работу, паралельна гандлююць экалагічнымі таварамі і дапамагаюць змяняць нашы ўстаноўкі.

### Экалагічны — паняцце не абсалютнае

— Усё адносна, у сваім вобразе жыцця я таксама бачу, што можна яшчэ палепшыць, але на 100 працэнтаў экалагічным ніхто сябе назваць не можа. Не ўсе тавары, якія пазіцыянуюць як «зялёныя», насамрэч з'яўляюцца экалагічнымі — часам вытворцы абмяжоўваюцца толькі гучнымі заявамі. Такая з'ява атрымала назву «грынвошынг» («зялёны камуфляж») — гэта ўвод пакупніка ў зман. Маркетолагі зразумелі, што прыйшоў час экатрэнду, экалагічныя тавары прадаюцца лепш, таму сталі пэўным чынам маркіраваць альбо рэкламаваць іх «экалагічныя» ўласцівасці.

Якія праявы «грынвошынгу» можна ўбачыць у нашых крамах? Гэта вось такія гучныя надпісы, як «эка-», «бія-», «арганік», «100 працэнтаў натуральны», «чысты»... Чалавек бачыць іх і думае, што, набываючы такі тавар, наблізіцца да экалагічнага спажывання. Маніпуляцыі з зялёным колерам цяпер праводзяцца паўсюдна. Фарміруецца вобраз — раз такі колер, значыць, экалагічны.

Вельмі часта на ўпакоўцы ці поліэтыленавым пакеце чытаем: біяраскладальны альбо зроблены з біяпалімераў. Тут таксама трэба разбірацца. Справа ў тым, тлумачыць Ірына, што сам па сабе пластык нікуды не знікае, ён разбураецца, але гэта, наадварот, садзейнічае яго больш хуткай міграцыі ў паветра, глебу, ён трапляе такім чынам да нас у арганізм. Часта пішуць, што ўпакоўка з крухмалу, цукровага трыснягу, але часта туды ўсё роўна дадаюць палімеры, бо ў абсалютна чыстым выглядзе складана стварыць упакоўку з біяпалімераў, тады і аб экалагічнасці гаварыць няма чаго.

### Што хаваецца пад закруткай

— У нас у краіне існуе шмат розных экапраектаў, дзе любы ахвотны можа сябе праявіць. Такія арганізацыі займаюцца не толькі праблемамі экалогіі навакольнага асяроддзя, а яшчэ і сацыяльнымі пытаннямі. Напрыклад, у праекце KaliLaska, які вядзе збор рэчаў, будуць рады валанцёрам на сартаванне, для кіравання лагістыкай, разбору заявак. Ёсць эксасацыяльны праект Krysharikі, думаю, усе бачылі яркія кантэйнеры, куды збіраюць пластмасавыя закруткі. Справа ў тым, што пластыкавыя бутэлька і закрутка — з рознага пластыку. Той, з якога зроблена апошняя, вельмі цэніцца перапрацоўшчыкамі, і калі здаваць іх асобна, можна атрымаць больш грашовых сродкаў. Усе яны накіроўваюцца на дапамогу дзеткам з асаблівасцямі развіцця. У асноўным на атрыманыя грошы набываюць прадметы быту для дзяцей, інвалідныя каляскі і г. д. Цяпер праекту асабліва патрабуюцца валанцёры, якія змогуць дапамагаць з дастаўкай закрутак з розных гарадоў.

Яшчэ адзін сацыяльны праект, пра які расказала Ірына, называецца «Кнізе — другое жыццё». Яго стварылі супрацоўнікі прадпрыемства «Белгіпс-эка», што займаецца зборам і перапрацоўкай макулатуры. Дзякуючы праекту нераўнадушныя грамадзяне прывозяць непатрэбныя кнігі, а іншы раз — і цэлыя хатнія бібліятэкі. Усе яны перадаюцца ў рэгіянальныя бібліятэкі, у дамы ветэранаў, інтэрнаты і г. д. Ірына гаворыць, што яе як эколага гэта радуе.

**Надзея ЗУЕВА.**
**Фота дадзены гераіняй.**

# «КАЛІ ГЭТА ТВАЁ, ТО ЯНО ЦЯБЕ ЗАЦЯГНЕ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Цяпер у іншым месцы сябе не бачу. Ні ў паліклініцы, ні ў стацыянары. Мне падабаецца разнастайнасць працы на «хуткай», — гаворыць дзяўчына.

Канчаткова пераканацца ў тым, што «гэта яе», дапамагла інтэрнатура. Аляксандра праходзіла яе ў розных аддзяленнях Кобрынскай ЦРБ.

— Мяне адпраўлялі па іх, бо я мусіла працаваць на «хуткай» з разнапланавымі выпадкамі. Я была і ў кардыялогіі, і ў неўралогіі, і ў інфекцыйным аддзяленні. Цікава: шмат атрымліваеш досведу, бо ўсюды свае падыходы. Але ж хваляваннаў перад непасрэднай работай па размеркаванні ўсё роўна было шмат.

Я сама па сабе не вельмі хуткі чалавек. Люблю ўсё рабіць размерана, у сваім тэмпе. Баялася, што буду нешта не паспяваць выконваць на выкліку. Страшна было трапіць у ступар, спалохацца і не ведаць, як дзейнічаць. Але пакуль што такога не было, заўжды рэагавала як трэба.

Па словах дзяўчыны прызвычаіцца да ўсіх гэтых думак дапамагае тое, што ты працуеш не адзін: «З табой ёсць яшчэ людзі, і гэта вялікая падтрымка».

Аляксандра працуе ў камандзе з фельчарам Аленай Артысюк і кіроўцам Васілём Навашчуком. Дзяўчына адзначае, што ў яе рабоце



вельмі важна тое, як члены каманды ўзаемадзейнічаюць адзін з адным: «Цяпер мы на выкліку можам літаральна вачыма перамовіцца і зразумець адзін аднаго».

Урачы хуткай медыцынскай дапамогі працуюць зменамі з васьмі да васьмі.

— Імкнешся заўсёды прыйсці раней, каб падмяніць калегу і падрыхтавацца да працы, — расказвае Аляксандра. — Але часта бывае так, што яшчэ васьмі няма, а ты ўжо едзеш да пацыента.

Колькі ж выклікаў можа быць за адну змену? Па-рознаму: і тры, і трынаццаць.

За час работы на «хуткай» дзяўчына зразумела, што тут можа спатрэбіцца амаль любы навык. Ажно да... спеваў і танцаў.

— Напрыклад, калі ты прыязджаеш на дзіцячы выклік, там патрэбен зусім асаблівы падыход. Трэба супакоіць маленькага пацыента, адцягнуць увагу, аглядзець, яшчэ і ўкол зрабіць.

Вельмі важную ролю, па словах Аляксандры, мае фізічная сіла, бо медыкі хуткай дапамогі часта транспартуюць пацыентаў на насілках. Акрамя таго, трэба валодаць пэўнымі ведамі ў псіхалогіі, каб супакоіць хворага, які расхваляваўся, і не паддацца пры гэтым эмоцыям самому. А яшчэ дзяўчына падкрэслівае, што важна ўмець адрозніваць хлусню ад праўды.

— Бывае, прыязджаеш на выклік і бачыш, што табе літаральна хлусяць у твар, — расказвае Аляксандра. — Часцей за ўсё наконт прыёму прэпаратаў. Многія не прызнаюцца, многія нечага саромеюцца. Наогул, не трэба так рабіць: калі «хуткую» выклікаеш і табе дрэнна — кажы ўжо ўсю праўду як ёсць, таму што так хутчэй дапаможам.

Мы пацікавіліся ў Аляксандры, чаго найбольш баіцца ўрач хуткай медыцынскай дапамогі.

— Не вытрываць, — шчыра адказвае дзяўчына. — Асабліва калі гэта цяжкі выклік да дзяцей. Увогуле, страшна недааццаніць стан пацыента.

Але ж у цэлым наконт сваёй працы гераіня адгукаецца даволі станоўча.

— Гэта штодзённае ўдасканальванне сябе ў прафесійным, і ў асобасным плане. Ты кожны дзень даведваешся нешта новае. Вучышся карэктна камунікаваць з людзьмі, больш выразна бачыш іх псіхалагічны стан, — дзеліцца Аляксандра. — Я інтраверт, таму ў пачатку мне было крыху складана. Цяпер нашмат лягчэй, і, мне здаецца, з досведам усё будзе толькі лепш.

Таксама дзяўчына падкрэслівае, што праца на хуткай дапамозе з-за сваёй разнапланавасці не дае нічога забыцца. Перыядычна так ці інакш трэба ўспамінаць усе веды, атрыманыя ва ўніверсітэце. А яшчэ Аляксандры падабаецца працоўны тэмп. Па словах дзяўчыны, хуткасць дапамагае заўсёды быць у тонусе. Да таго ж ёй пашанцавала з калектывам. Па яе словах, гэта вельмі спагадлівыя і станоўчыя людзі. Вядома, часам нашай гераіне бывае цяжка працаваць, таму што так ці інакш, але ты эмацыянальна ўключаешся ў праблемы пацыента.

Для таго каб падрыхтавацца да работы на хуткай дапамозе, наша гераіня рэкамендуе студэнтам папрацаваць у гэтай сферы падчас вучобы.

— Было б выдатна, калі б быў досвед работы хаця б у нейкім аддзяленні, у ідэале, вядома, на «хуткай». Пасля трэцяга курса мы можам уладкоўвацца на пасады сярэдняга медперсаналу. Гэта вельмі дапамагае.

Па словах дзяўчыны, звычайна на «хуткай» «выжываюць» актыўныя людзі з добрымі камунікатыўнымі навыкамі, якія адкрыты да новых ведаў.

— Работа ў службе хуткай дапамогі вельмі цікавая і поўная эмоцый і энергіі. Але разам з тым ёсць цяжкасць у плане псіхалагічных нагрузак, — разважае Аляксандра. — Калі штодня сутыкаешся з людзьмі, якім дрэнна і балюча, проста быць не можа. Калі больш прываблівае работа ў кабінеце, то «хуткая» дакладна не для цябе. Але калі гэта тваё, то яно цябе зацягне.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

*Даніна пашаны*

# КОД ПАМЯЦІ, ЯКІ НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ

**Безнадзейна-чорнае, вогненна-чырвонае, празрыста-сіняе і ахінутае святлом — галоўнае было здабыць эмоцыю. Складаны праект «Лінія памяці. Код вайны» прадставілі на сцэне спартыўна-культурнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

Атрымаўся спектакль публіцыстычнага гучання, у якім спалучыліся словы, спевы, пластыка, танец. Усе выяўленчыя сродкі (і тэхнічныя таксама) выкарыстаны дзеля таго, каб нагадаць гісторыю падзей, якія адбываліся ў Беларусі і з беларусамі з 1941 да 1945 года. Ды не толькі нагадаць, а стварыць эмацыянальны выбух. Вядома, з разлікамі перш за ўсё на моладзь: каб яна адчувала, што значыць патрыятызм, як яго разумеюць у Рэспубліцы Беларусь. Стваральнікі зыходзілі з пытання: што мы ведаем пра вайну?

Гэта боль і жах, пакуты і катаванні, галеча і сіроцтва, смерць... І жаданне выжыць, якое ўласцівае чалавеку — маленькаму і даросламу. Мірнаму жыхару і вайскоўцу. Дзе б і ў якіх умовах чалавек ні знаходзіўся: на акупаванай тэрыторыі ці ў канцлагеры (а ў іх утрымліваліся не толькі дарослых, але і дзяцей). Публіцыстычная частка даносіцца голасам актрысы Веры Паляковай. З рэальнымі гісторыямі, фотаздымкамі і лічбамі, па якіх можна ўявіць глыбіню і маштаб трагедыі, у выніку якой адбывалася расчалавечванне адных, а іншых імкнуліся ператварыць з асоб у рэчы, што маркіравалася лічбай: чаравік 3209, вязень 32 815. «Лічбы на сэрцы» — гэта не толькі асабісты боль мастака Міхаіла Савіцкага, але і крык пра тое, што не павінны перажываць людзі. Гэта і пра тое, што «ніколі больш»... Але ў Беларусі ў гэтым, здаецца, нікога не трэба пераконваць. Але нагадваць, рэтранслiраваць у сучаснай форме тым, хто падрастае цяпер, у краіне будуць, напэўна, доўга.



Грамадска значны, асветны, патрыятычны праект атрымаў грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у навуцы, адукацыі, ахове здароўя і культуры. Аўтар і галоўны балетмайстар спектакля — старшы выкладчык кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Вольга Наўроцкая. Але разам з ёй асобныя фрагменты ў якасці балетмайстраў стваралі Ірына Капуста, Стас Грэчка, Ганна Лепо, Юлія Ролева, Дзмітрый Бяззубенка. Задзейнічалі немаленькую рэжысёрска-пастановачную групу ў складзе Агаты Мацко, Яны Калачынскай, Валерыя Салаўёва, Іны Лазаравай, Віктара Салаўя, Яўгена Камароўскага, Віктара Крылова, Аляксандра Барскага. Насамрэч кожны асобны фрагмент (ці песня) можа жыць сваім жыццём. Усё робяць і ствараюць маладыя людзі. Асноўныя сілы — студэнтаў кафедры харэаграфіі ўніверсітэта культуры (па спецыяльнасці «Эстрадны і сучасны танец). Але ў праекце задзейнічаны юныя чытальнікі, пераможцы конкурсу «Жывая класіка» мінулага года. Далучыліся і дзіцячыя харэаграфічныя калектывы: узорны ансамбль танца «Натхненне», танцавальны праект «RDC» са сталіцы і «Stay Dance project» з Рагачова. У спектаклі гучыць сучасная музыка — ад Дзмітрыя Парфёнава, Travis Lake, Iday.

Колькасць людзей на сцэне, якія змяняюць адзін аднаго, таксама дадае эмоцый: заўсёды кранальна бачыць, як стараюцца юныя артысты, як імкнуцца зрабіць добра, бо тэма такая, што інакш нельга. Беларусь сапраўды страціла ў тую вайну шмат: «кожны трэці» — гучыць у спектаклі. І нават беларускіх дзяцей не трэба пераконваць: ніколі больш (настолькі глыбока гэтая тэма ўваходзіць сёння ў іх свядомасць). Яны і самі здольныя ў гэтым пераконваць дарослых, ад якіх залежыць іх будучыня.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

*Лакацыі актыўнасці*

## «Дарога магчымасцяў»

**Рэспубліканскі сэрвісны працоўны праект пад такой назвай стартаваў у краіне.**

Яго рэалізацыя стала магчымай дзякуючы пагадненню аб супрацоўніцтве, якое Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская чыгунка заключылі ў маі мінулага года. У рамках пагаднення 145 байцоў сэрвісных студэнцкіх атрадаў прайшлі навучанне па адукацыйнай праграме прафесійнай падрыхтоўкі працоўных (служачых) з прысваеннем кваліфікацыі, разраду па прафесіі «праваднік пасажырскага вагона 5-га разрада».

У ліпені — жніўні ў Мінскім, Баранавіцкім, Брэсцкім, Гомельскім і Віцебскім вагонных участках яны будуць працаваць у складзе сэрвісных студатрадаў праваднікамі на маршрутах Мінск — Адлер, Анапа, Санкт-Пецярбург, Мурманск, Архангельск; Брэст — Масква, Санкт-Пецярбург, Полацк, а таксама на мясцовых напрамках Віцебск — Гродна, Мінск, Брэст; Гомель — Гродна, Брэст; Гродна — Мінск, Гомель, Крычаў.

Яшчэ 127 байцоў будаўнічых студатрадаў атрымалі працоўную прафесію «манцёр пуці». У складзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў яны працуюць у Мінскай, Аршанскай, Ваўкавыскай, Брэсцкай, Гомельскай, Жлобінскай і Калінкавіцкай дыстанцыях пуці і выконваюць работы па мантажы і дэмантажы канструкцый верхняй будовы пуці, рэйкавых стыкаў і г. д.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Навука «ў полі»*

## БЛІЖЭЙ ДА АРТЭФАКТАЎ З РАСКОПАК

**Студэнты-археолагі БДУ ў чэрвені-ліпені праводзяць раскопкі комплексаў на рацэ Менцы і каля вёскі Рэчкі. Даследаванні праходзяць у рамках вучэбнай практыкі першакурснікаў гістарычнага факультэта. Для выканання работ на аб'ектах іх падзялілі на дзве групы.**

Студэнтаў, якія працуюць у экспедыцыі на археалагічным комплексе ракі Менкі, упершыню чакалі работы на тэрыторыі ўмацаванага паселішча, якое дала назву сучаснай сталіцы Беларусі — Мінску. Раскопкі праводзяцца пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

А каля вёскі Рэчкі Вілейскага раёна будучыя археолагі прадоўжылі раскопкі старажытных курганоў, яны даследуюць гарадзішча, а таксама праводзяць работы па выяўленні бескурганных пахаванняў. Кіраўніком практыкі выступіла загадчыца кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Паліна Курловіч. Дарэчы, вывучэнне гэтага комплексу праводзіцца з 2020 года. За гэты час археолагам ужо ўдалося знайсці каштоўныя артэфакты. Сярод іх — керамічны чыгун, крэміраваныя косці чалавека, бронзавыя ўпрыгожванні, рагавы грэбень, плаўленыя вырабы з каляровага металу, бронзавыя пранізкі, фрагмент скроневага кольца і інш.

«Перад намі стаіць задача навучыць студэнтаў методыцы правядзення раскопак, паказаць, як правільна даследаваць артэфакты, і пазнаёміць іх з помнікамі археалогіі, — падзялілася сваімі думкамі Паліна Курловіч. — Я спадзяюся, што ўсе атрымаюць задавальненне ад працы і мы здзейснім новыя адкрыцці».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

Ірына КАЛТОВІЧ:

# «ВУЧОНЫ — ГЭТА АСОБА, НЕЗАЛЕЖНА АД ТАГО, МУЖЧЫНА ЁН, ЦІ ЖАНЧЫНА...»



**У школьныя гады наша гераіня звязвала сваю будучыню толькі з урачэбнай практыкай. І гэта нядзіўна, бо вырасла яна ў медыцынскай сям'і. Маці і сваякі — усе былі звязаныя з гэтай сферай. Часта пасля ўрокаў дзяўчынка сядзела на кушэтцы і глядзела, як матуля вядзе прыём пацыентаў у дыягнастычным цэнтры. Прымярала гэтую ролю на сябе. Але сёння Ірына Калтовіч вядомая зусім іншымі сваімі дасягненнямі. Як навука заняла ўсё яе жыццё без астатку і наколькі ўтульна адчуваюць сябе жанчыны-даследчыцы ў Нацыянальнай акадэміі навук, Ірына расказала ў праекце «Плеяда маладых»...**

## ПРЫЙШЛА І АДРАЗУ ЎЛЮБІЛАСЯ

— Ніколі не думала, што стану вучоным, — шчыра кажа наша суразмоўніца. — Я карэнная магіляўчанка, і калі заканчвала адзінаццаты клас з залатым медалём, то выбірала паміж магілёўскімі ВНУ. Мы з бацькамі вырашылі, што я застануся вучыцца ў сваім горадзе. Але ў нашым абласным цэнтры няма медыцынскага ўніверсітэта, таму месца вучобы я выбірала метадам ад адваротнага. Палічыла, што машынабудаўнічы інстытут (Беларуска-Расійскі ўніверсітэт. — **Аўт.**) у большай ступені арыентаваны на хлопцаў. Маці раіла мне паступаць у педінстытут (Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова. — **Аўт.**), але ў той момант я не ўяўляла сябе ў ролі настаўніка, хоць на сёння, акрамя навуковай, таксама актыўна займаюся і педагагічнай дзейнасцю, і мне гэта вельмі падабаецца. Мяне прыцягваюць да выкладання студэнтам, я была старшынёй камісій па абароне дыпломаў, магістарскіх дысертацый, прымала экзамены, чытала лекцыі. І мне вельмі цікава працаваць са студэнтамі. Часта даводзіцца выступаць перад маладзёжнай аўдыторыяй, перад школьнікамі, папулярызаваць і прафесію вучонага, і вынікі сваёй навуковай дзейнасці. Прызнаюся, мне гэта ўсё вельмі па душы.

Маімі любімымі прадметамі ў школе былі матэматыка і хімія. У выніку выбар спыніўся на Беларускім дзяржаўным універсітэце харчовых і хімічных тэхналогій. Шчыра кажу: я тады не зусім разумела, кім буду і хто такі тэхнолаг харчовай вытворчасці. Не падазравала, што за адміністрацыйным будынкам размяшчаюцца вялізныя вытворчыя плошчы (*смяецца.* — **Аўт.**) Універсітэт таксама скончыла з чырвоным дыпломам. Калі шукала сабе месца для праходжання пераддыпломнай практыкі, выкладчыкі падказалі, што ў структуры Нацыянальнай акадэміі навук ёсць Інстытут мяса-малочнай прамысловасці. Я здзівілася, бо нічога пра яго не чула. Пачала збіраць інфармацыю. Звярнулася да кіраўніцтва інстытута, папрасіла ўзяць мяне на пераддыпломную практыку. Прыйшла сюды і... засталася.

Хтосьці бачыць сябе ў навуцы яшчэ ў школьным узросце, але я нават у студэнцкія гады такі варыянт для сябе не разглядала. І толькі калі трапіла ў Інстытут мяса-малочнай прамысловасці РНПЦ НАН Беларусі па харчаванні, напэўна, упершыню пра гэта задумалася. Менавіта тут і ўлюбілася ў навуку. Пазней мяне запрасілі сюды па размеркаванні. **У выніку ў маёй працоўнай кніжцы ёсць толькі адзін запіс: я прыйшла і працую ў Інстытуце мяса-малочнай прамысловасці НАН ужо 14 гадоў.** У 2015 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю, у 2018 годзе атрымала званне дацэнта. Спачатку працавала інжынерам, цяпер — загадчыкам сектара комплексных даследаванняў мясных прадуктаў аддзела тэхналогій мясных прадуктаў, узначальваю Савет маладых вучоных і спецыялістаў у нашым інстытуце і з'яўляюся намеснікам старшыні Савета маладых вучоных Аддзялення аграрных навук НАН.

Хацела калісьці быць урачом, а ў выніку займаюся цяпер здаровым харчаваннем. Заўважу, што ад яго наша з вамі здароўе залежыць на 80 працэнтаў. Мы займаемся харчаваннем для прафілактыкі розных захворванняў, а таксама харчаваннем для людзей, якія церпяць ад пэўных захворванняў (харчовага дыябету, цэліякіі, фенілкетанурыі і гэтак далей), распрацоўваем спецыяльнае харчаванне для розных катэгорый насельніцтва: спартсменаў, навучэнскай моладзі, цяжарных жанчын, людзей пажылога ўзросту...

Мой тата быў спартсменам, кандыдатам у майстры спорту па вольнай барацьбе. Пэўны час працаваў трэнерам. На жаль, ён ужо пайшоў з жыцця. І я лічу вельмі знакавым для сябе, што аб'яднала медыцыну і спорт у сваёй навуковай рабоце. Гэта менавіта тыя напрамкі, якім прысвяцілі сябе мае бацькі.

## ГЛЯДЗЕЦЬ ПАД РОЗНЫМ РАКУРСАМ

***— З 2016 года ў свеце адзначаюць Міжнародны дзень жанчын і дзяўчат у навуцы. Ён быў заснаваны, каб пераадолець перашкоды і дапамагчы жаночай палове чалавецтва ісці ў нагу з часам, выбіраць для сябе найбольш запатрабаваныя і актуальныя на рынку працы спецыяльнасці. Ірына, а ці сутыкаліся вы калі-небудзь з гендарнай дыскрымінацыяй у навуковым асяроддзі і стэрэатыпамі, што жанчына першапачаткова прайграе мужчыну, прычым не толькі ў навуцы?***

— Я кандыдат тэхнічных навук, а жанчын сярод кандыдатаў тэхнічных навук насамрэч не вельмі шмат. Мяркую, што невялікае прадстаўніцтва жанчын сярод кандыдатаў і дактароў навук па тэхнічных дысцыплінах звязана з тым, што на тэхнічныя спецыяльнасці паступае невялікая колькасць дзяўчат. Напрыклад, у маёй ВНУ былі спецыяльнасці, дзе вучыліся практычна адны хлопцы. Але для мяне асабіста маюць значэнне найперш прафесійныя і дзелавыя якасці чалавека, і я не падзяляю калег па поле. Вучоны — незалежна ад таго, мужчына ён ці жанчына, — гэта асоба. Увогуле, лічу, што для навукі важная калабарацыя жанчын-вучоных і даследчыкаў-мужчын: штосьці атрымліваецца лепш у першых, а штосьці — у другіх. Калі на адзін і той жа прадмет глядзець пад розным ракурсам, вынік можа атрымацца вельмі нечаканы.

Калі казаць пра Нацыянальную акадэмію навук, то жанчын у агульнай колькасці яе даследчыкаў прыкладна палова. Кіраўніцтва нашага інстытута ў роўнай ступені ўдзяляе ўвагу прафесійнаму росту як мужчын, так і жанчын-даследчыц, і я ніколі не сутыкалася з прадузятасцю, хоць існуе стэрэатып, што мужчынам у навуцы працей, чым нам. Канешне, на кіраўніцкіх пасадах мужчын больш, але гэтаму ёсць тлумачэнне. Мяркую, на жанчын у нашым грамадстве ўскладзена функцыя захавальніцы сямейнага ачага: на ёй і хатнія абавязкі, і дзеці, і муж... Жанчыне даводзіцца перарываць сваю кар'еру на дэкрэтны адпачынак, пасля якога складаней вярнуцца да ранейшага рытму. Але я не лічу, што жанчына абавязкова павінна рушыць па кар'ернай лесвіцы да самага верху. І справа зусім не ў тым, што нам страшна ўзяць на сябе такую адказнасць. Проста ў гэтым выпадку трэба ўмець знаходзіць баланс паміж сям'ёй і работай. Увогуле, кожны кіруецца ўласнымі жыццёвымі каштоўнасцямі, сваім разуменнем жыцця і сваімі амбіцыямі.

***— А вам удаецца знайсці такі баланс? За плячыма ў вас яшчэ і Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Актыўная грамадская работа — таксама сур'ёзная нагрузка...***

— Вы закранулі балючую тэму. Хтосьці працуе ад званка да званка, а я так не ўмею. Прыходжу на работу раней за іншых, а сыходжу апошняя, буду сядзець усю ноч, не кіну работу, пакуль не буду задаволеная яе вынікам. Ніколі не ведаю, калі скончыцца мой працоўны дзень. Дарэчы, з мужам, а ён у мяне медык, мы тое, што адбываецца ў нас на працы, дома не абмяркоўваем. Шчыра кажучы, у мяне вечарам ужо і сіл на гэта няма (*смяецца.* — **Аўт.**). У адпачынку я таксама заўсёды на сувязі, тэлефон ніколі не адключаю, нейкія пытанні даводзіцца вырашаць дыстанцыйна. Разумею, што такое стаўленне да працы перашкаджае жыць, бо асабістага часу зусім не застаецца. Але як мне змяніць сябе? Я, на жаль, не ведаю...

Мне пастаянна даводзіцца працаваць у рэжыме шматзадачнасці. Функцыя кіраўніка падраздзялення — генерыраваць ідэі для новых напрамкаў даследаванняў, афармляць праекты, праводзіць іх экспертызу, планаваць эксперыменты, выконваць іх са сваімі супрацоўнікамі ў лабараторыі, устанаўліваць заканамернасці, пісаць справаздачы. Я цалкам паглыбленая ў навуку. Таксама знаходжуся ў пастаянным кантакце з прадпрыемствамі, якія ўкараняюць новую прадукцыю і ў якіх узнікаюць пытанні па сыравіне, захаванні патрабаванняў бяспекі. Ты павінен быць кампетэнтным ва ўсіх пытаннях, бо інакш вытворцу чакаюць сур'ёзныя фінансавыя страты.

## НАДРУКАВАЦЬ... МЯСНЫ ПІРОГ

***— На рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі» вы перамаглі сёлета са сваім праектам, які быў прысвечаны мясному 3D-прынцінгу. Потым прадстаўлялі яго на рэспубліканскай выстаўцы навукова-тэхнічных дасягненняў «Беларусь інтэлектуальная». Раскажыце, як узнікла ідэя?***

— Калі ты вучоны, то сочыш за сусветнымі трэндамі. Сёння пра 3D-друк ведаюць, напэўна, ужо ўсе. Колькі гадоў таму мяне зацікавіла інфармацыя, што ў Лондане дзейнічае рэстаран, дзе ўся мэбля надрукаваная на 3D-прынтары і ўсе стравы, якія падаюцца гасцям, таксама гатуюцца на 3D-прынтары. Ажыятаж быў такі, што ахвотныя замаўлялі столік у гэтай установе за некалькі месяцаў.

Мясны 3D-прынцінг — новы напрамак у харчовай прамысловасці, які мае шмат пераваг. Замест чарнілаў у картрыджах — харчовыя інгрэдыенты. З дапамогай гэтай тэхналогіі можна індывідуалізавана мадэляваць харчовую і біялагічную каштоўнасць прадукту, уключаць у яго тыя мікра- і макраэлементы, якія патрабуюцца канкрэтнаму чалавеку і, наадварот, выключаць з прадуктаў непатрэбныя кампаненты, каб папярэдзіць алергічную рэакцыю.

3D-мясны прынцінг спрыяе развіццю персаніфікаванага лячэбна-дыетычнага, спартыўнага, дзіцячага і гіпаалергеннага харчавання. Таксама тэхналогія дазваляе ўлічваць індывідуальныя патрэбы пажылых людзей, якія маюць, напрыклад, дэфіцыт кальцыю, спартсменаў — для дасягнення імі высокіх вынікаў і гэтак далей.

Таксама пры шэрагу захворванняў патрабуюцца прадукты пэўнай кансістэнцыі — мы можам вырашаць задачу з дапамогай 3D-мяснога прынцінгу. Гэта тэхналогія дазваляе вырабляць унікальныя прадукты нестандартнай формы і дызайну з зададзеным смакам па спецыялізаваных заказах спажыўцоў. Для дзяцей, якія адмаўляюцца есці, можна рабіць прадукты ў выглядзе персанажаў з папулярных мульцікаў, «надрукаваць» арыгінальны мясны пірог. Дзіця з задавальненнем з'есць такі прадукт. Пры гэтым мы зможам забяспечыць патрэбы арганізма тымі нутрыентамі, якія патрэбныя для росту і развіцця канкрэтнага дзіцяці. На выстаўцы «Беларусь інтэлектуальная» бацькі не маглі адцягнуць сваіх дзяцей ад 3D-прынтара, які друкаваў ежу.



### Асабістае дасье

Ірына Калтовіч была адзначана стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным (2022 год); Падзякай Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі за плённую работу ў Савеце маладых вучоных НАН Беларусі і высокія дасягненні ў навуковай дзейнасці (2022 год); дыпломам лаўрэата конкурсу «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2019 год); дыпломам лаўрэата Рэспубліканскага конкурсу, прысвечанага Году навукі, у намінацыі «Найлепшая навуковая праца маладых вучоных» (2017 год); стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аспірантам (2013 год); стыпендыямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для адораных навучэнцаў і студэнтаў (у 2007—2009 гадах).

У нашым інстытуце распрацаваныя ўнікальныя тэхналогіі вытворчасці 3D-мясных прадуктаў, 3D-мясных сумесяў і 3D-мясных эмульсій. Заўважу, што 3D-мясныя прадукты маюць цалкам натуральны склад, для мясных сумесяў выкарыстоўваецца толькі высакаякасная сыравіна, у іх адсутнічаюць харчовыя дабаўкі. Яны вылучаюцца працяглым тэрмінам захоўвання — да шасці месяцаў пры тэмпературы 18 градусаў (плюс-мінус два градусы). Іх можна браць у палярныя экспедыцыі і нават у касмічныя палёты. Па сутнасці, гэта абязводжанае мяса, канцэнтрат, які аднаўляецца па аналогіі з бульбяным пюрэ хуткага прыгатавання. Толькі ты атрымліваеш карыснае мяснoе пюрэ.

Такім чынам, мы можам задаволіць патрэбы ў харчовых прадуктах асобных сектараў: ваеннай, касмічнай, турыстычнай, медыцынскай галіны. Такія прадукты будуць незаменнымі ў харчаванні пацыентаў у медыцынскіх стацыянарах і рэабілітацыйных цэнтрах.

Па сутнасці, размова ідзе пра ежу наступнага пакалення. Не выключана, што ў недалёкай будучыні такія прынтары будуць стаяць у кожнай гаспадыні як кухонныя камбайны, да якіх мы ўсе даўно прызвычаіліся.



Летась я заяўляла сваю распрацоўку на «100 ідэях» у намінацыі «Аграпрамысловыя тэхналогіі», але ўсё ж такі 3D-прынцінг — інавацыйны напрамак. Таму ў гэтым годзе праект «HoReCa 3D-food printing» выставіла ў намінацыі «Найлепшая бізнес-ідэя», дзе ён і перамог.

Дарэчы, сярод наведвальнікаў і экспертаў на ўсіх выстаўках, форумах і навукова-практычных мерапрыемствах, на якіх дэманструецца наш праект, заўсёды назіраем вялікую цікавасць. Людзі пытаюцца, калі і дзе з'явіцца такі прынтар, каб можна было прыйсці ў кавярню і замовіць сабе, напрыклад, мяснoе піроянае...

***— А насамрэч, калі і дзе?***

— Гэты напрамак знаходзіцца яшчэ на пачатковай стадыі развіцця. Для таго, каб ён стаў папулярным і даступным для грамадзян, трэба зрабіць нямала працы. Выкарыстанне друку для прадпрыемстваў сегмента HoReCa дазволіць кавярням і рэстаранам забяспечыць канкурэнтныя перавагі і павялічыць суму сярэдняга чэка. Многім наведвальнікам будзе цікава, як на іх вачах друкуюцца пірог, піца ці піроянае да чаю ці кавы. Мы пралічвалі акупляльнасць гэтых тэхналогій і прыйшлі да высновы, што выкарыстанне 3D-прынцінгу будзе прыносіць прыбытак у сярэднім ужо пасля паўгода.

Знайсці пункт грамадскага харчавання, зацікаўлены ва ўкараненні новай тэхналогіі, не праблема. Але найперш трэба падрыхтаваць нарматыўныя дакументы, прайсці шматлікія працэдуры, а гэта вялізны аб'ём работы.

## САМАЯ ЦІКАВАЯ ПРАФЕСІЯ Ў СВЕЦЕ

***— Прызнайцеся, калі вы выбіралі навуковую кар'еру, у вас былі сумненні наконт вашай фінансавай самастойнасці? Ці на першым плане была ўсё ж такі самарэалізацыя?***

— Я не меркантыльны чалавек. Цяпер маладыя прыходзяць і адразу пытаюцца, а колькі яны будуць зарабляць. Мы такія пытанні саромеліся задаваць. Маладым вучоным у Нацыянальнай акадэміі навук аказваецца сур'ёзная падтрымка, такая, пра якую ў некаторых сферах могуць толькі марыць. Ведаю, пра што кажу. Першыя некалькі месяцаў пасля пераезду ў сталіцу я здымала пакой, а потым мне далі месца ў акадэмічным інтэрнаце. Затым прапанавалі арэнднае жыллё ў комплексе «Магістр».

Цяпер усім маладым спецыялістам, якія прыходзяць да нас па размеркаванні, адразу даюць месца ў інтэрнаце, ім не трэба клапаціцца пра дах над галавой, можна цалкам паглыбіцца ў навуку. Пазней з'явіцца і магчымасць для будаўніцтва. Зразумела, што маладыя спецыялісты не могуць адразу шмат зарабляць, але кіраўніцтва інстытутаў і навукова-практычных цэнтраў шукае магчымасці, каб іх падтрымаць, прапануюць удзел у праектах, якія добра фінансуюцца, міжнародных канферэнцыях, семінарах, стажыроўках для маладых вучоных. Сістэма падтрымкі маладых навукоўцаў уключае ў тым ліку магчымасці атрымання стыпендый і грантаў. Калі магістрант ці аспірант прыходзіць у акадэмію, ён можа ўдзельнічаць у рэспубліканскіх і акадэмічных конкурсах, напрыклад, у конкурсе на прэмію ў гонар славутых акадэмікаў. Штогод праводзіцца конкурс «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Удзельнічаць у ім могуць маладыя навукоўцы, якія абаранілі кандыдацкую дысертацыю ва ўзросце да 30 гадоў. Лаўрэаты конкурсу ўключаюцца ў банк даных «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» і ў рэзерв кіруючых кадраў НАН Беларусі, атрымліваюць штогадовы грант на ўдзел у міжнародным навуковым, навукова-арганізацыйным або навукова-практычным мерапрыемстве, а таксама штогадовую прэмію ў памеры да сямі базавых ставак у перыяд уваходжання ў банк даных. Асноўным рухавіком маладзёжнай палітыкі ў Акадэміі навук выступае Прэзідыум сумесна з Саветам маладых вучоных. У прыватнасці, у мой інстытут прыходзяць і замацоўваюцца шмат маладых тэхнолагаў, якія актыўна ўключаюцца ў даследчую працу. Да нас размяркоўваюцца выпускнікі з майго ўніверсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, з БДТУ, біялагічнага факультэта БДУ і інш.

***— А што вы параілі б дзяўчатам, якія сёння стаяць перад выбарам. Ці ісці ім у навуку?***

— Для мяне навука — надзвычай захапляльны і творчы занятак. За гады работы ў структуры Нацыянальнай акадэміі навук я пераканалася, што **прафесія вучонага — самая цікавая ў свеце, таму што твой новы працоўны дзень ніколі не будзе падобны на папярэдні. Мы знаходзімся ў пастаянным пошуку, адкрываем новыя заканамернасці, усё жыццё самаўдасканальваемся, расцём і як спецыялісты, і як асобы.** Таму я адназначна параіла б ісці ў навуку, нават нягледзячы на тое, што яна патрабуе поўнай самааддачы. І тым, хто яшчэ стаіць на парозе прафесійнага выбару, параіла б паступаць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій. Займацца здаровым харчаваннем вельмі важна і цікава. Сёння я ўжо проста не бачу сябе па-за навукай...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*Аўдыяверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.*

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Унитарное предприятие
«Могилевское отделение БелТПП»
8 августа 2023 в 14.00
проводит торги по продаже следующих объектов

| № п/п | Наименование объекта продажи | Описание | *Начальная цена продажи и составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей* | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | РВС-10000 № 12, инв. № 02002/15, ЛПДС «Дисна» | Объем 10 000 м куб., год выпуска 1974 | 58 726,60 (пятьдесят восемь тысяч семьсот двадцать шесть рублей 60 копеек) | 5 872,66 (пять тысяч восемьсот семьдесят два рубля 66 копеек) |
| | РВС-10000 №17, инв. № 02006/4, ЛПДС «Дисна»; РВС-10000 №18, инв. № 02006/5, ЛПДС «Дисна»; РВС-10000 № 20, инв. № 02006/6, ЛПДС «Дисна»; РВС-10000 № 21, инв. № 02006/7, ЛПДС «Дисна» | Объем 10 000 м куб., год выпуска 1988 | | |

- продажа имущества проводится с обязательным условием проведения всего комплекса демонтажных работ в соответствии с проектно-сметной документацией;

- материалы, образовавшиеся после ликвидации имущества, являются собственностью покупателя;

- демонтажные работы проводятся в условиях действующей производственной площадки, которая относится к объектам промышленной безопасности, и как следствие, на подрядчика распространяются соответствующие требования по организации работ;

- срок выполнения демонтажных работ – 2023 год.

Сметный расчет, типовой договор купли-продажи, квалификационные требования при проведении демонтажных работ размещены на сайте продавца www.mogilev.cci.by

**Собственник имущества:** унитарное предприятие «Запад-Транснефтепродукт», Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Котловца М. П., д. 29, УНП 400084287, тел. для осмотра объектов продажи 80236240551.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 25 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 8 августа 2023 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к.112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. Последний срок подачи заявления – 7 августа 2023 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 8 августа 2023 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, + 375 33 607 08 05 (А1) – Жилина Ольга Александровна.

БЕЛАРУСБАНК

| Извещение о проведении торгов | |
|---|---|
| Наименование объекта | Лот № 1: изолированное помещение, инв. № 120/D-19384;<br>Лот № 2: капитальное строение, инв. № 120/D-20716 |
| Месторасположение объекта | Лот № 1: Брестская обл., г. Береза, ул. Кирова, 4-2;<br>Лот № 2: Брестская обл., г. Береза, ул. Кирова, 4/1 |
| Продавец объекта | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| Организатор торгов | Брестское ОУ № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| Площадь | Лот № 1 – 481,3 кв. м;<br>Лот № 2 – 239,4 кв. м |
| Начальная цена продажи с учетом НДС – 20 % | Лот № 1 – 296 837,35 руб. (двести девяносто шесть тыс. восемьсот тридцать семь руб. 35 коп.);<br>Лот № 2 – 57 543,47 руб. (пятьдесят семь тысяч пятьсот сорок три руб. 47 коп.) |
| Сумма задатка | Лот № 1 – 30 000,00 руб. (тридцать тыс. руб. 00 коп.)<br>Лот № 2 – 5 700,00 руб. (пять тыс. семьсот руб. 00 коп.) |
| Информация о земельном участке | Земельный участок<br>с кадастровым № 120850100002000001,<br>с площадью – 0,2055 га |
| Характеристика объекта | Лот № 1: стены – кирпичные, перекрытие – железобетонные плиты; кровля – металлическая черепица; полы – паркет, плитка, бетон, линолеум; окна – ПВХ-профиль; двери – ПВХ профиль, металлические; внутренняя отделка – обои, штукатурка с покраской, плитка; отопление, холодное водоснабжение и канализация – централизованная система; вентиляция – естественная.<br>Лот № 2: фундамент – бетон; стены – кирпич силикатный; перекрытия – плита железобетонная; кровля – рулонные кровельные материалы; полы – бетон; окна – ПВХ-профиль, двери, ворота – металлические, деревянные; отопление, электроснабжение, водоснабжение – централизованная система; вентиляция – естественная |
| Условия оплаты | По договоренности победителя торгов с собственником имущества |

Торги состоятся 7 августа 2023 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал на 9-м этаже. Документы для участия принимаются по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409, до 14.00 3 августа 2023 года.

Для участия в торгах к моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с **BY69AKBB66708597000020000000**, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 100325912.

Если на участие в торгах подана только одна заявка, то объект продается этому участнику (с его согласия) по начальной цене, увеличенной на 5 %. Договор купли-продажи заключается в течение 40 рабочих дней с даты проведения торгов.

Тел. (80162) 277518.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором торгов с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов.

Торги проводятся путем пошагового увеличения цены. Шаг торгов – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем торгов возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Затраты по оформлению правоустанавливающих документов несет покупатель. Регистрируется недвижимость в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

Договор купли-продажи по результатам проведения торгов должен быть подписан в течение 40 рабочих дней со дня проведения торгов.

*06 июля 2023 года в издательском доме «Звязда» опубликована проектная декларация на строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки).*

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ № 12

**На строительство объекта:** ««Строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)». II очередь строительства. Индивидуальные жилые дома, КПП, ограждение территории.

**Информация о застройщике**

**Застройщик:** производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 08 ноября 2000 года № 1266, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100011299.

**Юридический (почтовый) адрес:** 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817.

**Режим работы для приема заявлений и заключения договоров:**

понедельник – пятница с 9.00 до 18.00.

— Праграма александрыйскага свята вельмі складаная для арганізатараў, але вельмі цікавая для тых, хто прыйдзе сюды адпачываць, — прызнаецца ён. — Мы рыхтуемся доўга, расстаўляем пункты, размяркоўваем лакацыі. За месяц тут былі ўжо ўбітыя калкі, і кожны ведаў сваё месца. Трэба, каб суседства было гарманічнае і адна пляцоўка плаўна перацякала ў другую. У кожнага свята — свой настрой, свой сімвал. Мы паглыбляемся ў аўтэнтыку, якая ідзе з глыбіні вякоў, у нашу мову, культуру, абрады, абярэг, які сілкуе нас. Тут і лялькі з тварам і без, і паясы, і арнаменты, і наш галоўны абярэг бусел — сімвал міру і стваральнай працы, які раскрые крылы над галоўнай фальклорнай пляцоўкай. Яшчэ 20 рэгіёнаў Расіі прывязуць свае абярэгі. Будуць гучаць агульныя славянскія песні. Дняпро аб'ядноўвае нашы народы, і гэтай сувязі ніхто не зможа разарваць. Госці адчуюць на сабе подых розных культур і эпох.

Вялікія відэаэкраны манціруюцца так, каб гледачам было зручна назіраць канцэртныя нумары з любога месца купальскага поля. Сёлета тут будзе яшчэ і сцэнічная пляцоўка ад Саюзнай дзяржавы.

— Гэта дапамога неацэнная, — удакладніў Валерый Малашка. — Дзмітрый Мезенцаў доўга прыглядаўся да нас, прыязджаў сюды, яшчэ будучы паслом Расійскай Федэрацыі. Цяпер у якасці дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы ён падтрымаў наша мерапрыемства. Гэта будзе асобная сцэнічная прастора. Канцэрт зорак Саюзнай дзяржавы пачнецца ў 18.00.

Летась купальскае свята наведалі 70 тысяч гасцей, сёлета чакаюць яшчэ больш. У тым ліку і афіцыйных. Валерый Малашка адзначае, што па колькасці дзяржаўных асоб Купалле сёлета мала чым будзе саступаць Форуму рэгіёнаў.

— На аўторак ужо шэсць губернатараў расійскіх рэгіёнаў пацвердзілі свой асабісты ўдзел у свяце, плюс палітычныя дэлегацыі шэрагу рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі і 20 рэгіёнаў прысылаюць сваіх майстроў, якія прадстаўляюць усю палітру культуры расійскага народа на працягу тысячагоддзяў, — удакладніў суразмоўца. — Важна, што мы зможам весці тут і эканамічныя дыялогі. Фармат народнай дыпламатыі самы дзейсны і ўплывовы. Ён пракладзе шлях да вялікай дыпламатыі, вялікіх палітыкаў, заклікае да міру на зямлі і ў нашых душах.

У сераду александрыйскую пляцоўку наведала кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Мар'яна Шчоткіна. Каб на месцы ацаніць, як будзе выглядаць сцэнічная пляцоўка Саюзнай дзяржавы, і тыя ўмовы, якія прапануюць топавым гасцям.

**Дырэктар Магілёўскай абласной філармоніі Святлана ЕФІМУК** расказала, што артысты рыхтуюць цікавую канцэртную праграму.

— Асобны сцэнічны комплекс ад Саюзнай дзяржавы парадуе вялікімі экранамі, лазерным шоу, спецэфектамі. Усе тэхнічныя магчымасці накіраваныя на тое, каб паказаць высокі клас, — паведаміла яна. — У вялікім канцэрце «Саюзныя зоркі ў гасцях у Александрыі» артысты расійскай і беларускай эстрады ў адным творчым парыве праспяваюць вядомыя і многімі любімыя песні.

Чатырнаццаты год запар прадпрыемства «Дамачай» радуе наведвальнікаў смачнай кухняй і гастранамічнымі сюрпрызамі.

— Падрыхтоўку пачынаем з пачатку года, — удакладняе **генеральны дырэктар ААТ «Булачна-кандытарская кампанія «Дамачай» Вольга ЦІМАФЕЕНКА.** — Распрацоўваем канцэпцыю і дэталі нашага ўдзелу ў свяце. Мы прадстаўлены тут некалькімі дзясяткамі павільёнаў.

Дарэчы, кампанія корміць не толькі гасцей свята, але і артыстаў. Алена Ланская, у прыватнасці, аддае перавагу салатам з гароднiны і фруктам, а Руслан Аляхно ў захапленні ад рыбных страў.

Попытам карыстаецца беларускі крупень ад «Дамачая», які ў заходніх краінах ведаюць як трдзельнік. Гэта цеста ручной работы, якое выпякаецца на вуглях і пасыпаецца цукрам і карыцай. Аказваецца, гэта таксама наша традыцыйная страва. Сёлета «Дамачай» прапануе новы від квасу з хрэнам. Ну і вядома, будзе шмат пірагоў з рознымі начынкамі, у тым ліку гігантскіх — вагой да 40 кілаграмаў! Кампанія запрашае на сваю пляцоўку «Мір. Хлеб. Стваральная праца».

Да свята рыхтуецца, здаецца, уся Александрыя. Затрымліваюся каля сімпатычнага двухпавярховіка — дома сямейнага тыпу Алены і Аляксея Цвятковых, якія выхоўваюць пяцярых дзяцей. Ён якраз на маршруце ад прыпынку грамадскага транспарту да купальскага гарадка. Летась госці свята вельмі актыўна фатаграфаваліся на фоне ўстаноўленага сям'ёй арт-аб'екта — веласіпеда. Сёння Цвятковы размахнуліся на цэлую кампазіцыю. Нават зрабілі сажалку з мастком і пасадзілі шмат кветак. Іх у Цвятковых на любы густ: гартэнзіі, петуніі, лілеі, сукуленты...

— Мы так чакаем гэтае свята — словамі не перадаць, — прызнаецца Алена. — Летась цэлы дзень гулялі, вечарам шашлыкі рабілі — радасці не было канца.

Цалкам гатовая да сустрэчы гасцей тутэйшая сярэдняя школа. Дырэктар Кацярына Пятроўская прызнаецца, што Купалле — вельмі радасная падзея для аграгарадка. Гэта і гісторыя, і традыцыі. Шмат хто прыходзіць сюды ў музей — цікава ж убачыць, дзе вучыўся першы беларускі Прэзідэнт. Сёлета тут сваю экспазіцыю, прысвечаную тэматыцы свята, размесціць яшчэ і абласны краязнаўчы музей імя Е. Раманава. У суботу школа будзе працаваць у рэжыме адкрытых дзвярэй з 10.00 да 21.00. Менавіта ў гэты час адбываецца наплыў наведвальнікаў. Сюды ідуць і афіцыйныя дэлегацыі, і ўдзельнікі мерапрыемстваў, і звычайныя турысты. У школе традыцыйна размяшчаюцца грымёркі беларускіх і расійскіх зорак эстрады. Тут будуць рыхтавацца да выступленняў Надзея Кадышава, Зара, Анатоль Ярмоленка і іншыя. У школе знаходзіцца і прэс-цэнтр купальскага свята, які ўстанова рыхтуе сумесна з «Белтэлекамам».

Што датычыцца пражывання ў мясцовай гасцініцы, то трэба мець на ўвазе, што ўсе 70 нумароў былі забраніраваныя задоўга да пачатку Купалля. Хаця які там сон у купальскую ноч? Наконт пошуку папараць-кветкі ў праграме нічога не заяўлена, затое дыскатэка да трох раніцы нядзелі запланаваная.

Арганізатары нагадваюць, што на свяце вітаецца стыль адзення кэжуал, жанчынам лепш устрымацца ад абутку на абцасах, а мужчынам — ад гальштукаў. Не лішнім будзе прыхапіць капелюшы, а адчувальным да сонца — яшчэ і парасоны. А вось напоі і марожанае можна з сабой не везці — тут гэтага будзе досыць і на любы густ. Запрашаюць з разуменнем ставіцца да правіл бяспекі і цяжкія клункі пакідаць у камерах захоўвання, якія тут будуць як на тэрыторыі пляцоўкі, так і за яе межамі. Не трэба турбавацца наконт санітарнай зоны. Цэлы квартал прыбіральняў тут стаяў ужо ў аўторак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

*Шклоўскі раён.*

---

Традыцыі і сучаснасць

# УБАЧЫЦЬ ДАГЭТУЛЬ СХАВАНАЕ МІНУЛАЕ

## У гэтым археолагам дапаможа новы ўнікальны праект

**Навукоўцы БДУ ўпершыню ў краіне праводзяць пошук археалагічных помнікаў з выкарыстаннем лазернага скaніравання. Над унікальным міждысцыплінарным праектам працуюць выкладчыкі і студэнты адразу двух факультэтаў: гістарычнага і геаграфіі і геаінфарматыкі.**

Метад паветранага лазернага скaніравання (тэхналогія LiDAR) заключаецца ў выкарыстанні лазернага сканера, устаноўленага на беспілотным лятальным апараце. Прыбор скануе паверхню глебы з частатой да 200 000 імпульсаў у секунду, што дазваляе атрымліваць дэталёвыя мадэлі мясцовасці. Атрыманыя мадэлі даюць магчымасць выявіць дагэтуль схаваныя археалагічныя аб'екты, такія як старажытныя гарадзішчы, могільнікі і курганы, выявіць заканамернасці іх размяшчэння, стварыць дэталёвыя планы.

Упершыню дадзены метад быў апрабаваны ў 2022 годзе ў Мінскім, Мядзельскім, Валожынскім і Вілейскім раёнах. Гэтай восенню плануюць правесці новыя даследаванні на тэрыторыі полацкай зямлі — каласкі беларускай дзяржаўнасці. Запланавана абследаванне тэрыторый і аб'ектаў, якія маюць асаблівую гістарычную каштоўнасць. Пасля выяўлення і картаграфавання помнікі будуць вывучаны археолагамі БДУ.

Навукоўцы спадзяюцца, што сабраныя матэрыялы дапамогуць не толькі ў інвентарызацыі помнікаў археалогіі, але і дадуць магчымасць зразумець культуру і быт людзей, якія насялялі нашу краіну тысячу гадоў таму. Выяўленне археалагічных аб'ектаў дасць магчымасць вызначыць асаблівасці мясцовага рассялення першабытных людзей, гаспадарчага асваення земель, матэрыяльнай і духоўнай культуры, пахавальных абрадаў і тым самым унесці значны ўклад у развіццё беларускай гістарычнай навукі.

Галоўнай перавагай метаду з'яўляецца яго прастата, дакладнасць, магчымасць хутка абследаваць вялікія тэрыторыі і знаходзіць нават тыя аб'екты, якія схаваныя пад ляснымі масівамі. Выкарыстанне традыцыйных падыходаў у археалогіі больш працаёмкае і затратнае, а таксама ўскладняецца прыроднымі ўмовамі.

Ідэя праекта належыць старшаму выкладчыку кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм Аляксею Сазонаву і загадчыцы кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Паліне Курловіч. За тэхнічнае забеспячэнне і прымяненне ГІС-тэхналогій адказвае факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ, а пытаннямі археалагічных даследаванняў займаецца гістарычны факультэт.

Адзначым: праект атрымаў перамогу ў конкурсе «Гістарычная памяць беларусаў» Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў і будзе рэалізаваны з 2023 да 2025 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33, тел.: +375 (17) 363-99-40 | | |
| **Извещение о проведении открытого аукциона** | | **Дата, время проведения аукциона** | **Срок подачи заявления на участие в торгах** |
| **Предмет аукциона:** 1. Изолированные помещения, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/1-1, 33/1-2, 33/1-3. Начальная цена (без НДС): 1 413 300,00 бел. руб. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by 2. Дебиторская задолженность ОАО «Сукно» в количестве 45 лотов, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33. Полный состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by | | **21.07.2023 в 14.00** | **с 9.00 06.07.2023 до 17.00. 20.07.2023** |
| **Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** Лица, желающие принять участие в аукционе обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390 | | | |
| **Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»** | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **10 (десяти) дней** со дня проведения аукциона (по дебиторской задолженности) и **15 (пятнадцати) дней** со дня проведения аукциона (по изолированным помещениям), если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов | | | |
| Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 0,5 до 10 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте: www.cpo.by | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов не менее чем за день до наступления даты проведения торгов без объяснения причин снятия | | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** | | |

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении **18 июля 2023 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42 | | | |
| 1 | Спектроденситометр X-Rite eXact Advanced NGHXRC40E апертура 4mm, серийный номер 000722, инвентарный номер 2994, 2013 год выпуска | 1 260,00 | 126,00 |
| 2 | Программное обеспечение Ink Form. 6 PrinterPro, ID 223185599, IF s/n 122575, 2018 год выпуска | 3 720,0 | 372,00 |

**Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз»**, Минская обл., г. Борисов, ул. Ибаррури, 42 . Конт. тел. +375296555051.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:** **1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 17.07.2023 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by

**С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению Добрушское РайПО (продавец) извещает о проведении **8 августа 2023 года** открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1**: кап. строение с инв. № 311/С-51753, площадью 1063,7 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100002000395 площадью 0,0858 га, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Плеханова, 11А.

Кап. строение с инв. № 311/С-30479, площадью 856,5 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100002000395 площадью 0,0384 га, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Плеханова.

В лот входит оборудование 17 ед., список на сайте www.deloocenka.by

**Начальная цена** продажи без НДС – 156 400,00 бел. руб. **Задаток** – 15 640,00 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона.

**Продавец: Добрушское РайПО**, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел. +375 29 690-00-10.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:** **1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 07.08.2023 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «Юнайтед Стил-Ситинг» (УНП 291479120), объявляет о проведении **18.07.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме. Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

## Извещение о проведении вторых повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | ООО «ИПМ-Консалт оценка» (УНП 191224638), г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «КовалевТранс» (УНП 491327139), Минская обл. Минский р-н, д. Обчак, здание бывшей 8-летней школы – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 246-13Б/2017 |
| **Антикризисный управляющий** | ООО «Управляющая компания «Экстраюст» (УНП 192044227), Минская обл., Минский р-н, с/с Щомыслицкий, д. 14а/1-1, каб. 1-53, район аг. Озерцо. Тел. +375 (29) 6697469 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Административное здание** (здание административно-хозяйственное, инв. номер 500/С-7042, об.пл. **775,3 кв. м**). Адрес **– г. Минск, ул. Бородинская, 17.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1351га** предоставлен продавцу на праве аренды (по 30.11.2027) для эксплуатации и обслуживания административного здания. ***Ограничения (обременения) прав:*** обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатационным организациям-владельцам инженерных коммуникаций | |
| **Начальная стоимость лота без НДС – 488 400,00 бел. руб.** (снижена на 40 %) **Минимальная цена лота без НДС – 325 600,00 бел.руб.** | |
| Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота. | |
| **Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по предварительному согласованию, контактный телефон +375 33 303 45 88 Анастасия | |
| Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 7 (семь) рабочих дней после проведения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов | |
| **Дополнительная информация:** | |
| Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется Постановлением Министерства экономики № 9 от 1 апреля 2019 года «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)». Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет. Собранием кредиторов ООО «КовалевТранс» (протокол от 26.04.2023) принято решение одобрить продажу капитального строения с инв. номером 500/С-7042 по адресу: г. Минск, ул. Бородинская, 17 без наличия документов, удостоверяющих их государственную регистрацию (технический паспорт), в соответствии с положениями Указа Президента Республики Беларусь № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» | |
| Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 2% от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.ipmtorgi.by | |
| Предыдущее извещение опубликовано на ЕГРСоБ и в газете «Звязда» 14.06.2023 | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов 21.07.2023 в 09.00. Окончание торгов 21.07.2023 в 16.00. |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с **9.00 06.07.2023 по 20.07.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by** | |

# Извещение о повторном открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 25 июля 2023 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Виктора Афанасьева, 22 (У-688, микрорайон «Заболоть») 440100000002008853 | 0,1033 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 11%. Фундамент железобетон; наружная площадь 148 кв. м | 373,84 | 37 228,12 (8 200,82; 29 027,30) | 7 400 |

Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление №400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть, предварительно ознакомившись с условиями оплаты вознаграждений банку за оказанные услуги (перечисление и возврат суммы задатка), до подачи заявления и при себе иметь необходимые реквизиты.

**Аукцион состоится 25 июля 2023 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 10 июля по 19 июля 2023 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (152) 626055, 626056. Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу РБ http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_object/, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, ГП «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Шкоднікі агуркоў

**На жаль, шкоднікі на агурках — распаўсюджаная з'ява, але калі своечасова распачаць меры, з імі можна змагацца.**

## ПАВУЦІННЫ КЛЕШЧ

Амаль нябачная для чалавечага вока казурка, здольная загубіць увесь ураджай агуркоў.

Цяпліцы і парнікі — яго ўпадабанае месца. Там амаль заўсёды тэмпература трымаецца на адзнацы 30 градусаў. А цёплы клімат вельмі падыходзіць для размнажэння павуціннага кляшча і для развіцця яго лічынак. Таму ў спякоту ён можа з'явіцца і на грунтавых агурках. Паразіт сілкуецца сокам, які знаходзіцца ў расліне, тым самым разбураючы хларафіл, неабходны расліне для жыццядзейнасці.



Пашкоджаныя клеткі адміраюць, расліна слабее. Белыя плямы на лісці агуркоў — адна з прыкмет з'яўлення павуціннага кляшча. Бо самога кляшча заўважыць складана. Яго памер не перавышае аднаго міліметра. Спачатку на лісці з'яўляюцца белыя кропкі, потым на адваротным баку з'яўляюцца плямы, у рэшце рэшт ліст жоўкне і засыхае.

Другая прыкмета — на расліне з'яўляецца вельмі тонкая светлая павуціна. Яна як быццам ахутвае расліну як кокан.

## БАХЧАВАЯ ТЛЯ

Існуе вельмі шмат разнавіднасцяў тлі. Бахчавая тля сілкуецца сокам агуркоў, кабачкоў, дыні. Памер яе невялікі — не больш за 4 мм у даўжыню. Прыкмета з'яўлення — жаўтлявыя лісты.

Тля выдзяляе адмысловы сок, які называецца падзь. Яго любяць харчавацца мурашкі. Таму яны ствараюць цэлыя калоніі з тлі, ахоўваюць яе, водзяць харчавацца на смачныя ўчасткі. І часта, каб вывесці тлю, трэба пачынаць змаганне з мурашак.



Але не заўсёды з'яўленні тлі звязана з імі — бывае, што яна сама залятае ў цяпліцу. Таму, калі прысутнасці мурашак не выяўлена, то можна апрацоўваць заражаныя расліны хімічнымі прэпаратамі і народнымі сродкамі.

## ТРЫПСЫ

Трыпс — гэта дробныя казуркі-шкоднікі. Яны сілкуюцца сокам раслін, жывуць часцей пад лісцем.

Хоць саміх іх заўважыць складана, але немагчыма не заўважыць слядоў іх знаходжання. На лісці з'яўляюцца белыя плямкі з чорнымі кропкамі. Калі не пачаць барацьбу своечасова, то з'явяцца дзіркі, потым ліст засохне.

Існуе некалькі метадаў барацьбы з імі: агратэхнічныя, біялагічныя, хімічныя.

Народныя метады таксама ёсць, але яны малаэфектыўныя.

## БЕЛАКРЫЛКА

Гэта матылёк з белымі крыламі і жаўтлявым цельцам. У даўжыню не больша за паўтара міліметра.

Істота аддае перавагу цёпламу і вільготнаму клімату, таму цяпліцы — яе ўпадабанае месца жыхарства.

Белакрылка сілкуецца сокам раслін і здольная літаральна выпіць з іх усё.

Наступствы знаходжання белакрылкі на агурках не суцяшальныя: расліна спыняецца ў развіцці, становіцца ломкай, на лісці з'яўляюцца белыя плямы, потым расліна згортваецца і сохне.

На лісце можа з'явіцца лiпкі пласт — сляды жыццядзейнасці паразіта. Гэты налёт прыцягвае ў цяпліцу мурашак і грыбок. Ён выглядае як чорны налёт, цалкам захоплівае лісце і перашкаджае і так аслабленым раслінам атрымліваць сонечнае святло.

## МУХІ

Як выглядаюць звычайныя мухі, ведаюць усе, але шкоднікам, які перашкаджае ўзыходам агуркоў, з'яўляецца парастковая муха. Гэтая маленькая шэрая мушка, не больш за 6 мм у даўжыню, адкладае лічынкі ў зямлю. Менавіта там яны праводзяць большую частку свайго жыцця і ядуць усё, што падвернецца ім на шляху, часцей за ўсё насенне — пранікаюць унутр і з'ядаюць мякаць. Такое насенне ўжо, вядома, не ўзыдзе. Тое насенне, якое выжыла, сур'ёзна пашкоджана, і паўнацэнная расліна з яго не вырасце.

Мухі таксама пранікаюць у сцябло парастка і выпіваюць усе сокі. Такія расліны хутка сохнуць і спыняюць развіццё. На градках з мухай парасткі амаль не ўзыходзяць ці яны з'яўляюцца з-пад зямлі вельмі тонкімі і кволымі.

## НЕМАТОДА

Нематода — маленькія чарвякі, у даўжыню не больш за паўтара міліметра. Убачыць іх няўзброеным вокам амаль немагчыма. Існуе шмат разнавіднасцяў гэтых шкоднікаў. Некаторыя з іх пашкоджваюць сцёблы. Жывуць усярэдзіне і сілкуюцца сокам расліны. Выявіць іх можна па патаўшчэннях і ўздуцці на сцябле. Гэта не дае прайсці пажыўным рэчывам, і расліна пачынае паміраць. Некаторыя чарвякі жывуць у лісці і высмоктваюць сок. На такім лісці спачатку з'яўляюцца белыя плямы, потым яны жоўкнуць і адміраюць. Ёсць чарвякі, якія жывуць на каранях расліны, ствараючы там цэлыя калоніі. Яны запаўняюць сабой карані і не даюць пажыўным рэчывам праходзіць вышэй па расліне.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.46 | 21.42 | 16.56 |
| Віцебск — | 4.28 | 21.40 | 17.12 |
| Магілёў — | 4.36 | 21.32 | 16.56 |
| Гомель — | 4.42 | 21.20 | 16.38 |
| Гродна — | 5.03 | 21.55 | 16.52 |
| Брэст — | 5.13 | 21.47 | 16.34 |

## Месяц

*Поўня 3 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

## Імяніны

***Пр.*** *Соф'і, Ульяны, Антона, Арцёма, Барыса, Георгія, Германа, Дзяніса, Сямёна, Фёдара.*
***К.*** *Дамінікі, Люцыі, Тэрэзы, Эдварда.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 6 ЛІПЕНЯ

У краіне

**1788** год — нарадзіўся Дамінік Манюшка, беларускі асветнік. Стрыечны брат кампазітара Станіслава Манюшкі. Пасля заканчэння Віленскага ўніверсітэта атрымаў вучоную ступень доктара права. Браў удзел у вайне 1812 года. З 1816-га жыў у маёнтку Радкаўшчызна ў Ігуменскім павеце (цяперашні Чэрвеньскі раён). Уласны маёнтак і зямельныя ўгоддзі аддаў у карыстанне сваім сялянам, пакінуўшы сабе толькі невялікі ўчастак. Заснаваў у павеце вучылішча, пансіянат для ўтрымання і выхавання сялянскіх дзяўчынак.



**1888** год — нарадзіўся (Быхаўскі раён) Іван Міхайлавіч Баранкевіч, празаік, нарысіст, перакладчык, удзельнік рэвалюцыйнага руху.

**1923** год — нарадзіўся Валянцін Георгіевіч Панамароў, беларускі пісьменнік. У 1949—1976 гг. — карэспандэнт «Правды», «Огонька», «Известий», «Літаратурнай газеты» па Беларусі, працаваў на Дзяржтэлерадыё Беларусі. Аўтар аповесцяў, апавяданняў, нарысаў.

**1953** год — нарадзіўся Барыс Андрэевіч Залескі, беларускі матэматык, доктар фізіка-матэматычных навук. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола (1987).

**1943** год — нарадзіўся Юрый Фёдаравіч Малікаў, расійскі спявак і кампазітар, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Заснавальнік і мастацкі кіраўнік ВІА «Самацветы» (цяпер «Канцэртны ансамбль «Самацветы» пад кіраўніцтвам Юрыя Малікава»).

**1918** год — у Маскве падчас работы V Усерасійскага з'езда Саветаў левыя эсэры паднялі антыбальшавіцкі мяцеж, які завяршыўся іх паражэннем.

**1923** год — быў сфарміраваны першы савецкі ўрад — Савет Народных Камісараў СССР (СНК СССР).

**1943** год — здзейсніў першы баявы вылет легендарны савецкі лётчык Аляксей Марэсьеў, які вярнуўся ў строй пасля страты абедзвюх ног. Да канца вайны лётчык-герой здзейсніў больш за 90 вылетаў і збіў 11 самалётаў ворага.



**У гэты ж год** нарадзілася Тамара Ільінічна Сіняўская, расійская спявачка, народная артыстка СССР і Азербайджана. У 1964—2003 гг. — салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра ў Маскве. Жонка народнага артыста СССР Мусліма Магамаева.

У свеце

**1898** год — нарадзіўся Ханс Эйслер, нямецкі кампазітар і грамадскі дзеяч, член Нямецкай акадэміі мастацтваў, аўтар музыкі гімна ГДР.

Так гаварыў...

**ТОМАС ДЖЭФЕРСАН:**

*«Я не заўважаў,*
*каб сумленнасць людзей*
*узрастала з іх багаццем».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Дарагая, якой каве ты аддаеш перавагу?**

**— Я хацела б моцную, але мяккую, танізуючую і далікатную, якая перавярнула б у мяне ўнутры ўсё, адкрыўшы свет спакус і нястрымнай адчувальнасці, закружыла і надала б новыя адчуванні...**

**— Можа, табе гарэлкі наліць?**

Думаеце, вы ведаеце, што такое стрэс? У маім дзяцінстве, калі вы прапусцілі серыю мульціка па ТБ, то вы проста прапусцілі яе. Назаўжды.

**— Як твая радасць пажывае?**

**— Масла трэба памяняць, ніяк рукі не дойдуць... Ці ты пра Алку?**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.785. Індэкс 63850. Зак. № 1696.

Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12